# ДАДАТКІ

## СТАТУТ ФЭДЭРАЛЬНАЙ РАДЫ БЕЛАРУСКІХ АРГАНІЗАЦЫЯЎ У АЎСТРАЛІІ[1]

Разьдзел 1.
Назоў арганізацыі:
Фэдэральная Рада Беларускіх Арганізацыяў у Аўстраліі.
У скароце: Ф.Р.Б.А.А.
Па-ангельску: THE FEDERAL COUNCIL OF BELARUSIAN ORGANIZATION IN AUST.
У скароце: F.C.B.O.A.

— §§§ —

Разьдзел 2.
Сядзібай Выканаўчага Камітэту Ф.Р.Б.А.А. ёсьць горад (сталіца штату), зь якога будзе выбраны старшыня й сакратар Выканаўчага Камітэту.

—§§§—

Разьдзел 3.
Ідэалягічны напрамак дзейнасьці Ф.Р.Б.А.А. ёсьць заснаваны й згодны з пастановамі Першага й Другога Ўсебеларускіх Кангрэсаў і абсяг працы якой ёсьць усе штаты Аўстраліі, дзе існуюць беларускія арганізацыі.

—§§§—

Разьдзел 4.
Мэты й заданьні Ф.Р.Б.А.А.:
1. Годна рэпрэзэнтаваць усіх беларусаў Аўстраліі перад аўстралійскімі ўладамі й іншымі нацыянальнымі арганізацыямі.
2. Падтрымоўваць, дапамагаць і прымаць удзел у міжнародных зьездах і канфэрэнцыях, якія стаяць на грунце вольнасьці й самавызначэньня ўсіх народаў і абароны правоў чалавека.

---

[1] Тэкст публікуецца паводле копіі, дасланай Аўгенам Грушам, але ў адрэдагаваным выглядзе, з захаваньнем стылістычных асаблівасьцяў.

3. Гуртаваць беларусаў Аўстраліі й утрымоўваць лучнасьць зь беларускімі арганізацыямі, якіх мэты ёсьць вызваленьне нашай Бацькаўшчыны Беларусі.

4. Захоўваць і распаўсюджваць нашу культурную й нацыянальную спадчыну.

—§§§—

Разьдзел 5.

Сяброўства ў Ф.Р.Б.А.А.

1. Кожная дзейная беларуская арганізацыя, якая налічвае ня менш як 10—15 сяброў, працуе для дабра беларускага народу й прызнае пастановы Першага й Другога Ўсебеларускіх Кангрэсаў, мае права мець аднаго прадстаўніка з вырашаючым правам голасу ў Ф.Р.Б.А.А.

2. Прадстаўнікоў у Ф.Р.Б.А.А. прымае Выканаўчы Камітэт, а зацьвярджае Агульны Зьезд дэлегатаў.

—§§§—

Разьдзел 6.

Выканаўчы орган Ф.Р.Б.А.А.

1. Выканаўчы орган ёсьць Выканаўчы Камітэт, які складаецца з старшыні, заступніка старшыні й сакратара (ён жа й скарбнік).

2. Выканаўчы Камітэт выбіраецца на Агульным Зьезьдзе дэлегатаў Ф.Р.Б.А.А. звычайнай бальшынёй галасоў з кадэнцыяй на два гады.

3. Ва ўсіх галасаваньнях у выпадку роўнасьці галасоў голас старшыні Прэзыдыюму ёсьць дэцыдуючым.

4. Усе пастановы Выканаўчага Камітэту павінны быць адобраныя ня менш як двума сябрамі Выканаўчага Камітэту.

—§§§—

Разьдзел 7.

Фінансы:

Грашовыя сродкі Выканаўчага Камітэту гэта гадавыя складкі сяброў — арганізацыяў. Суму ўстанаўляе Агульны Зьезд, а таксама дабравольныя ахвяры.

—§§§—

Разьдзел 8.

Рэвізійная камісія Ф.Р.Б.А.А.

Рэвізійная камісія ў складзе старшыні, сакратара й сябры выбіраецца на Агульным Сходзе Ф.Р.Б.А.А. з кадэнцыяй на 2 (два) гады.

—§§§—

Разьдзел 9.

Агульны Зьезд дэлегатаў Ф.Р.Б.А.А.

1. Агульны Зьезд дэлегатаў ёсьць найвышэйшай уладай Ф.Р.Б.А.А.



2. Агульны Зьезд можа быць звычайны (штодвагады) або надзвычайны.

3. Агульны Зьезд дэлегатаў Ф.Р.Б.А.А. склікаецца:

а. Выканаўчым Камітэтам Ф.Р.Б.А.А. з уласнай ініцыятывы.

б. На запатрабаваньне 60 % сяброў Ф.Р.Б.А.А.

в. На запатрабаваньне Рэвізійнай камісіі, толькі тыя справы, дзеля якіх ён быў скліканы.

5. Выканаўчы Камітэт паведамляе сяброў Ф.Р.Б.А.А. пісьмова не пазьней, як адзін месяц перад Зьездам, падаючы парадак дня.

6. Агульны Зьезд дэлегатаў выбірае Прэзыдыюм Зьезду Ф.Р.Б.А.А. і мандатную камісію (заданьнем якой ёсьць праверка мандатаў сяброў Ф.Р.Б.А.А.).

а. Агульны Зьезд прымае справаздачу Рэвізійнай камісіі.

б. Агульны Зьезд удзяляе абсалюторыюм уступаючаму Выканаўчаму Камітэту.

в. Прымае справаздачу Выканаўчага Камітэту й паасобных сяброў.

г. Прымае плян працы на наступную кадэнцыю.

д. Зацьвярджае бюджэт.

е. Прымае пастановы й рэзалюцыі, прапануе ці зьмяняе Статут.

7. Агульны Зьезд ёсьць важны, калі на ім прысутнічае 75 % сяброў Ф.Р. і паўнамоцтва іх праверана мандатнай камісіяй.

—§§§—

Разьдзел 10.

Правы й абавязкі сяброў Ф.Р.Б.А.А.

1. Кожны сябра мае права выбіраць і быць выбраным у кіруючы орган Ф.Р.Б.А.А.

2. Кожны сябра — арганізацыя, забавязана аплачваць гадавую складку. Аднагадовая залегласьць можа спрычыніцца да страты сяброўства.

3. Кожны сябра павінен годна рэпрэзэнтаваць імя сваёй арганізацыі, выконваць пастановы Агульнага Зьезду й Выканаўчага Камітэту ды браць актыўны ўдзел у дзейнасьці й працы Ф.Р.Б.А.А.

—§§§—

Разьдзел 11.

Правы й абавязкі Выканаўчага Камітэту Ф.Р.Б.А.А.

1. Выканаўчы Камітэт кіруе дзейнасьцю Ф.Р.Б.А.А. на працягу двухгадовай кадэнцыі й рэалізуе плян працы.

2. Прымае новых сяброў і ў неабходным выпадку завершвае сяброўства данай арганізацыі да наступнага Агульнага Зьезду.

3. Рэпрэзэнтуе Ф.Р.Б.А.А. навонкі (глядзі разьдзел 4 пункты 1 і 2).

4. Вядзе банковае конта й кіруе маёмасьцю Ф.Р.Б.А.А.

5. Старшыня кіруе ўсёй дзейнасьцю Выканаўчага Камітэту й рэпрэзэнтуе.

6. Заступнік старшыні дапамагае яму й у часе патрэбы заступае.

7. Сакратар (ён жа й скарбнік) перахоўвае ўсе дакумэнты Ф.Р.Б.А.А., вядзе касавую кнігу. Прадстаўляе касавую кнігу й усе дакумэнты на жаданьне Рэвізійнай камісіі, дае фінансавую справаздачу Агульнаму Зьезду.

—§§§—

Разьдзел 12.

Правы й абавязкі Рэвізійнай камісіі.

1. Рэвізійная камісія мае права кантраляваць дзейнасьць Выканаўчага Камітэту Ф.Р.Б.А.А.

2. У меру патрэбы, але абавязкова перад Агульным Зьездам, кантралюе касавыя кнігі й маёмасьць Выканаўчага Камітэту Ф.Р.Б.А.А.

3. Заносіць у пратаколы прабег і вынік кантролю.

4. Дае справаздачу Агульнаму Зьезду дэлегатаў зь дзейнасьці Выканаўчага Камітэту.

5. Робіць прапанову адносна абсалютарыюм уступаючаму Выканаўчаму Камітэту Ф.Р.Б.А.А.

—§§§—

Разьдзел 13.

Ліквідацыя Фэдэральнай Рады Б.А.А.

1. Ліквідацыя Фэдэральнай Рады Б.А.А. можа наступіць на прапанову й пастанову Агульнага Зьезду, калі на ім прысутнічае 75 % сяброў ды калі 75 % сяброў прысутных прагаласуе за ліквідацыю.

2. Агульны Зьезд дэлегатаў Фэдэральнай Рады Б.А.А. пастанаўляе аб маёмасьці Ф.Р.Б.А.А. звычайнай бальшынёй галасоў.

—§§§—

Гэты Статут уваходзіць у сілу адразу па прыняцьці яго Агульным Зьездам дэлегатаў Ф.Р.Б.А. у Аўстраліі й падпісаньні яго старшынёй і сакратаром Прэзыдыюму Агульнага Зьезду

| | |
|---|---|
| *Міхась Лужынскі* | *Др Язэп Малецкі* |
| Сакратар Прэзыдыюму | Старшыня Прэзыдыюму |
| Агульнага Зьезду дэлегатаў | Агульнага Зьезду дэлегатаў |
| Ф.Р.Б.А.А. | Ф.Р.Б.А.А. |

*Дня 27.12.1980 г.*

Увага: Гэты Статут Ф.Р.Б.А. у Аўстраліі згодны прыняць наступныя беларускія арганізацыі

| | |
|---|---|
| 1. Беларускае Аб'еднаньне ў Паўдз. Аўстраліі | Я. Ролсан<br>Ст-ня ўправы |



| | |
|---|---|
| 2. Парафія Б.А.П.Ц. у Адэляйдзе | К. Станкевіч<br>Ст-ня параф. рады |
| 3. Старшыня Вык. Камітэту Ф.Р.Б.А.А. | Др. Я. Малецкі |
| 4. Беларускі Цэнтральны Камітэт у Вікторыі | В. Гладкі<br>За ўправу Б.Ц.К. Сак-р. |
| 5. Каапэратыў Бел. Дому ў Мэльбурне | Ул. Сідлярэвіч<br>Ст-ня ўправы |
| 6. Бел. Аб'еднаньне ў Новай Паўдз.Валіі. Сыднэй | М. Лужынскі |
| 7. Бел. Радыёвы Камітэт у Сыднэі | А. Качан |
| 8. Бел. Аб'еднаньне ў Зах. Аўстраліі | А. Мароз |
| 9. Бел. Аб'еднаньне ў Аўстраліі | М. Зуй |
| 10. Бел. Вызвольны Фронт у Аўстраліі | А. Алехнік |
| 11. Незалежн. Беларуска-Аўстралійскае Аб'еднаньне ў Н. П. Валіі | А. Булаўскі<br>Ст-ня |
| 12. Бел. Грамадзка-Культурны Клюб у Сыднэі | К. Сіткоўскі |
| 13. Беларускі Жаночы Камітэт у Мэльбурне | О. Сьлесарэвіч<br>Ст-ня |
| 14. Беларуская мастацкая група «Лявоніха» | М. Бурнос |

## БЕЛАРУСКІ Й БЕЛАРУСАВЕДНЫ ДРУК АЎСТРАЛІІ (БІБЛІЯГРАФІЯ)[2]

### Асобныя выданьні

**1. Byelorussia (Whiteruthenia) under Russian occupation. Victims of Communist terrorism.** Melbourne, published by agreement with the Assotiation of Byelorussians in Gt. Britain LTd., 1950. — 6 p., map.

Экскурсы ў гісторыю Беларусі, статыстыка. Пераважна перадрук з: *Byelorussia (Whiteruthenia) under Russian occupation. 1949.*

**2. Sabornaje Archipastyrskaje Pasłańnie...** Australija—Niamieččyna, śniežań 1950. — 2 s.

Подпісы: *«Сьмірэнны Архіяпіскап Сяргей, Сьмірэнны Япіскап Васіль».*

**3. Беларуская Аўтакефальная Праваслаўная Царква ў Аўстраліі. [Вясёлых Калядаў.]** Аўстралія, 1953.

Сэрыя віншавальных паштовак.

**4. Задзіночаньне Беларускіх Вэтэранаў у Аўстраліі.** Брысбэн (Brisbane), Аўстралія, 1953.

Беларускі насьценны каляндар на 1954 год. Малога фармату.

**5. Клуніцкі Ул. Першыя крокі.** Сыднэй: Згуртаваньне Беларускіх Патрыётаў, 1953. — 14 с.

Агляд беларускага грамадзка-арганізацыйнага жыцьця ў Аўстраліі.

**6. Biełaruski Kalendar na 1954 hod.** [Australija], Zadzinočańnie Biełaruskich Veteranaŭ, 1953.

Крыху іншая вэрсія, чым пазыцыя 4.

**7. Zadzinočańnie Biełaruskich Veteranaŭ u Brisbane — Australia. Жыровіцкая Божая Маці — Апякунка Беларускага Народу.** Brisbane, лістапад 1953.

Паштоўка з выяваю абраза. Выканаўца Данат Яцкевіч. Арганізацыя выдала таксама паштоўкі «Вільня зімой», «Партызанскія Каляды», а таксама сэрыі выяваў сьвятых абразоў, беларускіх краявідаў і знакамітых гістарычных дзеячоў (сярод іншых Эўфрасіньні Полацкай і князя Вітаўта) ды віншавальных (велікодных і калядных) паштовак.

**8. Ramanowski A. Iron curtain [За жалезнай заслонай]: Sketches.** Sydney, 1955. — 11 p.

Альбом малюнкаў-скетчаў часоў калектывізацыі; чорна-белы. Адзіны альбом мастака.

**9. Задзіночаньне Беларускіх Вэтэранаў. Галоўнае Кіраўніцтва ў Аўстраліі і Новай Зэляндыі. Беларускі Вызвольны Фронт. Краёвы Штаб у Аўстраліі. Рэзалюцыя супольнага паседжаньня.** Мэльбурн, 27.05.1956. — 2 с.

Рататар; вялікі наклад.

[2] Паводле: Беларускі й беларусаведны друк на Захадзе. Асобныя выданьні. Бібліяграфія / Склад. Зора й Вітаўт Кіпелі. Нью-Ёрк — Менск, 2003. — 582 с. — З дадаткам некаторых пазыцыяў.



**10. Баян Д. Сьвяты вечар: Калядная гульня для дзяцей.** Мэльбурн: Задзіночаньне Беларускіх Вэтэранаў, 1957. — 6 с.

**11. Баян Д. Цяжкія дні: П’еса.** Мэльбурн, 1957. — 8 с.

**12. Баян Д. Падарунак: Калядная п’еса для дзяцей.** Мэльбурн: Задзіночаньне Беларускіх Вэтэранаў, 1958. — 7 с.

**13. Баян Д. Бязсонны Менск.** Мэльбурн: Задзіночаньне Беларускіх Вэтэранаў, 1958. — 6 с.

П’еса для тэатральнага гуртку.

**14. Случанін Л. Рагнеда: Паэма.** Мэльбурн, 1958. — 70 с. [Выд. 2.] (Бібліятэчка БВФ; Выпуск 1.)

На апошняй старонцы: *«Беларускі Вызвольны Фронт, выдавецтва «На Варце», Мэльбурн, Аўстралія».*

Вокладка й мастацкая афармленьне У. Шнэка-Случанскага.

Перадрук з выд.: Менск, 1944.

**15. Случанскі Ул. Драбы: Гістарычная аповесьць.** Мэльбурн, 1958—1960 [на тытуле: 1958; на апошняй старонцы: Здаў у друк 1958, выйшаў з друку 1960]. — 272 с. (Бібліятэчка Беларускага Вызвольнага Фронту; № 2.)

Уступ Сяргея Пасечнага, малюнкі аўтара.

**16. Баян Д. Цыганскае шчасьце: П’еса.** Мэльбурн: ЗБВ, 1959. — 8 с.

**17. А[рхімандрыт] М[адэст] [Мадэст Яцкевіч]. «Адзіны ратунак». Аўтакефалія Сьвятое Беларускае Праваслаўнае Царквы.** Мэльбурн, 1960. — 9 с.

**18. Даведкі з гісторыі аўтакефаліі Беларускай Праваслаўнай Царквы.** Мэльбурн, 1960. — 9 с.

**19. Каціхізіс, або навука веры.** Мэльбурн: Беларуская Аўтакефальная Праваслаўная Царква, 1960. — 22 с. Выд. 1. Апрацаваў архімандрыт Мадэст. Дазвол уладаў БАПЦ атрыманы 17.02.1959.

Пазначана: *«Выдадзена коштам Дзьмітра Кажуры, Васіля Ціхановіча й А[рхімандрыта] М[адэста]».*

**20. Новы Запавет: Закон Божы.** Мэльбурн, Аўстралія, надрукавана й выдадзена з благаславенства духоўных уладаў Сьвятое Беларускае Аўтакефальнае Праваслаўнае Царквы, дазвол з дня 17.02.1959, Мэльбурн (Вікторыя), 1 верасьня 1960. — 39 с., карты.

Подпіс: *«А[рхімандрыт] М[адэст]».*

**21. Стары Запавет: Закон Божы.** Мэльбурн: Беларуская Аўтакефальная Праваслаўная Царква, 1960. — 57 с. Апрацаваў айцец архімандрыт Мадэст. Дазвол атрыманы ад БАПЦ 17.02.1959.

**22. Старая песьня на новы лад — адказ спадару Пануцэвічу. «У газэце «Бацькаўшчына»...»** Аўстралія—Мэльбурн: Праваслаўнае Брацтва Сьвятога Юрыя-пераможцы, БАПЦ, 1961. — 3 с.

**23. Constitution of Byelorussian Orthodox Church in South Australia incorporated.** [Australia], 1961. — 11 p.

Статут і рэгулямін БАПЦ у Аўстраліі.

**24. Яго Высокапрэасьвяшчэнства Высокапрэасьвяшчэньнейшага Архіяпіскапа Сергія… Галавы БАПЦ на Захадзе… «Распараджэньнем Архірэйскае Канцэлярыі пастаноўлена…»** Аўстралія: БАПЦ, 1962. — 1 с.

Адлучэньне архімандрыта Мадэста ад БАПЦ 11.08.1962.

Подпісы: *«Архіяпіскап Сергій, Мітрафонны протаярэй Міхаіл Шчурко».*

**25. ВЭР [Янка Ролсан]. Каржаваты і цыбаты: Байка.** [Аўстралія], сьнежань 1963. — 6 с.

**26. Крапіва-Жыгучка Я. [Янка Ролсан]. Ня казка, а быль.** [Аўстралія], верасень 1963. — 6 с.

Гумарыстычная паэмка.

**27. Модэст, Архімандрыт. Адозва.** [Аўстралія, кастрычнік 1963]. — 2 с.

Датычыць выхаду а. Мадэста з БАПЦ.

**28. Крапіва-Жыгучка. [Янка Ролсан]. Сходка.** Адэляйда, кастрычнік 1964. — 7 с.

Паэма-гумарэска.

**29. Byelorussian Association of Australia. Byelorussia.** Fairfield (N.S.W.), 1965. — 1 p.

Інфармацыя пра Беларусь. Падрыхтавана для XI Канфэрэнцыі Антыкамуністычнае Лігі Народаў Азіі ў Маніле (Філіпіны). Падрыхтаваў Алесь Алехнік.

**30. Byelorussian Liberation Front (Australia). Byelorussia and her fight for freedom.** Fairfield (N.S.W.), 1965. — 4 p.

Інфармацыя пра тое, што беларуская эміграцыя выступае за незалежнасьць Беларусі.

**31. Byelorussian Association of Australia. Byelorussia and her fight for freedom.** Fairfield (N.S.W.), 1966. — 2 p.

Інфармацыйная брашура, падрыхтаваная Алесем Алехнікам і Міхасём Зуем да Канфэрэнцыі Антыкамуністычнай Лігі Народаў Азіі, якая адбывалася ў Сэуле (Карэя) у 1966 годзе.

**32. Olechnik A. Soviet Union — New Form of Russian Empire.** Sydney: Byelorussian Liberation Front, 1966. — 2 p.

Інфармацыйная брашура пра БССР як калёнію Расеі; раздавалася на XII Канфэрэнцыі Антыкамуністычнай Лігі Народаў Азіі ў Сэуле (Карэя) у 1966 годзе.

**33. Ролсан Я. Паэма пра Міхася і Ахрэма.** [Аўстралія, 1967]. — 29 с.

Подпіс пад паэмай: *«Крапіва-Жыгучка [J. Rollson]».*

**34. B[yelorussian] L[iberation] F[ront]. Byelorussia and her fight for freedom.** Fairfield (N.S.W.), 1970. — 4 p.

**35. Byelorussian Association of Australia. Byelorussia…** Fairfield (N.S.W.), 1971. — 1 p.

Інфармацыйная ўлётка.



**36. Olechnik A. Report from the Byelorussian Liberation Front. Present situation in Byelorussia. Resolution on Ondependence for Byelorussia.** Manila (Philippines): 5$^{th}$ Congress of the World Anti-Communist League. July 23, 1971. — 6 p.

**37. [Змагар за праўду.] Ведай праўду.** Аўстралія, 25.04.1977. — 5 с.

Брашура рэлігійнага зьместу.

**38. Беларуская Аўтакефальная Праваслаўная Царква. Малебен на дзяржаўныя Сьвяты і вячэрня ў нядзелю праваслаўя.** Пераклаў Мітрапаліт Андрэй. Выдаў Протапрасьвіцер а. Аляксандар. Кліўлэнд—Мэльбурн, 1978. — 36 с.

Таксама тытул у ангельскай мове.

**39. Ролсон Я. Кліч.** Адэляйда, 1980. — 82 с.

Зборнік паэзіі. Кніга выйшла 20.12.1980.

**40. Katchan O. 19$^{th}$ century: the rebirth of Byelorussian literature.** Canberra: Australian National University, July 1980. — 26 p.

Даклад на Канфэрэнцыі Цэнтру гуманітарных дасьледаваньняў у Аўстралійскім нацыянальным унівэрсытэце ў Канбэры.

**41. Паэма пра Міхася і Ахрэма.** Аўстралія, 1981. — 29 с.

Перавыданьне.

**42. Ролсон Я. Кліч.** Адэляйда, Аўстралія, 1982. — 109 с.

**43. Салавей А. Нятускная краса: Збор твораў.** Нью-Ёрк— Мэльбурн: БІНІМ, 1982. XVI + 373 с.

Рэдактар Антон Адамовіч; друк Міколы Прускага; вокладка Ірэны Рагалевіч.

Гл.: «Беларус», № 303—304, 1982.

**44. [Byelorussians in Australia]. Зьнявага нацыі…** Аўстралія, чэрвень 1982. — 5 р.

Пратэст беларускіх арганізацыяў Аўстраліі супраць паклёпу на беларусаў з боку амэрыканскай тэлевізійнай кампаніі CBS у прагараме «60 minutes». У беларускай і ангельскай мовах.

**45. Збор дакумэнтаў Сьв. Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы (на выгнаньні).** [Аўстралія], 1983. — 193 с.

Назоў таксама ў ангельскай мове з прыпіскаю: *Authorized by Metropolitan Andrew. Complited by the Consistory of BAO Church.*

**46. Byelorussia, land and people.** Adelaide: Byelorussian Association on S.A., Inc., 1983. — 23 p.

Агульная інфармацыя пра Беларусь для аўстралійскай энцыкляпэдыі.

**47. Беларуская А.П. Царква ў Паўдзённай Аўстраліі. «Моцна паважанаму духавенству…»** Hindmarch (South Australia), 2.04.1984. — 3 с.

Пра патрэбу згоды ў БАПЦ.

Подпіс: *«К. Станкевіч».*

**48. Ролсон Я. З глыбінь мінулага.** Адэляйда, 1984. — 80 с.

Аўтабіяграфічныя ўспаміны з жыцьця ў СССР.

**49. Шнэк Ул. Беларуская Краёвая Абарона: Уніформа і адзнакі (1944—1984).** [Аўстралія—Нямеччына]: Беларускі Вызвольны Фронт, [1984]. — 75 с.

Каляровы альбом, выдадзены ў гонар 40-х угодкаў стварэньня Беларускае Краёвае Абароны (1944—1984). Спэцыфікацыі радоў войскаў БКА. Альбом апрацаваны на падставе праекту, створанага пад кіраўніцтвам генэрала Кастуся Езавітава. Уступ Дзьмітрыя Касмовіча й Уладзімера Шнэка. У ангельскай і беларускай мовах.

**50. Беларусь і яе кнігі = Belorussia and its Books.** [Clayton (Victoria): Department of Slavoc Languages, Monash University, Australia], 1986. — 60 с.

Каталёг выставы; тлумачэньні ў ангельскай мове. Артыкул пра Беларусь ды беларускі друк.

**51. Ролсон Я. Кліч: [Зборнік паэзіі].** Адэляйда, 1986. — 109 с.

Пазначана: *«Кніга перавыдана й дабаўлена 21/7/1986. Я. Ролсон»*. Выглядае, што гэты асобнік — перавыданьне з 1982 году.

**52. Keneally T. A Family Madness.** Sydney—London—New York: Simon and Schuster, 1986. — 336 p.

Гісторыя беларускае сям'і, якая па Другой Сусьветнай вайне апынулася ў Аўстраліі.

**53. Беларускі Вызвольны Фронт, Мэльбурн, Аўстралія. Справаздача дэлегацыі Беларускага Вызвольнага Фронту з 20-й Канфэрэнцыі Сусьветнай Антыкамуністычнай Лігі ў Тайпэй (Тайвань).** Мэльбурн, 25.08.1987. — 5 с.

Палітычныя мэты беларусаў — адраджэньне беларускай дзяржавы.

Подпіс: *«Палкоўнік У. Шнэк»*.

**54. Introducing the Captive Nations of Eastern and Central Europe.** Melbourne, 1987. — 28 p.

Асобны адбітак артыкула пра Беларусь як паняволеную краіну. Гісторыя руху паняволеных краінаў у Аўстраліі. Пераплецена разам з інфармацыяй пра беларусаў Аўстраліі (5 с.).

**55. Introducing the Captive Nations of Eastern and Central Europe. [Byelorussia].** Melbourne, 1987. — 28 p.

Адзін з ініцыятараў і выдаўцоў брашуры — Беларускі Цэнтральны Камітэт у Вікторыі. Кароткая інфармацыя пра паняволеныя народы, улучна зь Беларусьсю.

**56. Biełaruskaja Narodnaja Respublika. Прэзыдэнт Беларускай Цэнтральнай Рады. «Дарагія суродзічы! Вітаем Вас з 44 угодкамі II Усебеларускага Кангрэсу».** Адзначэньне ўгодкаў II Усебеларускага Кангрэсу (Менск, 27.06.1944). Fairfield (N.S.W.), 27 чэрвеня 1988. — 1 с.

Подпісы: *«В. Цярпіцкі, сакратар; М. Зуй, выконваючы абавязкі прэзыдэнта БЦР»*.

**57. Byelorussia's Independence Day, March 25, 1918.** Australia, March 25, 1988.

Праграма. Інфармацыя пра падзеі ў Беларусі ў 1918 годзе.



**58. Katchan O. Byelorussians in Australia.** Sydney, 1988. — 7 p.

Выданьне скарочанага варыянту артыкула з энцыкляпэдыі *Australian People: an Encyclopedia of the Nation, its People and Their Origins. Sydney, 1988.*

**59. Катэхізіс праваслаўнай царквы. II, Аполёгэтыка (Абарона).** Geelong (Vic.), 2.II.1989. — 30 с.

Перакладнік і выдавец іпадыякан Міхась Шэка.

**60. Byelorussian Association of Australia. Асьведчаньне... [Заклік да аднаўленьня незалежнасьці Беларусі.]** Файрфілд (Н.П.В.), 14 красавіка 1989. — 1 с.

Подпіс: *«А. Алехнік, Гэнэральны Сакратар»*.

**61. Беларуская Народная Рэспубліка. Прэзыдэнт Беларускай Цэнтральнай Рады. Да Беларускага Грамадзтва!** Аўстралія, 2.25.1991. — 2 с.

Подпісы: *«М. Зуй — прэзыдэнт, Віталі Цярпіцкі — сакратар»*.

**62. Случанскі Ул. Аброк Кіеву. Сказ аб Рацібору, тысяцкім з Іскарасьценя.** Мэльбурн: На Варце, Беларускі Вызвольны Фронт, 1991. — 66 с.

**63. Случанскі Ул. Братчына. Сказ аб падарожніках Георгію і Саўку і аб слаўным гаспадару Полацкім Князю Расьціславу.** Мэльбурн: На Варце, Беларускі Вызвольны Фронт, 1991. — 24 с.

**64. Шнэк Ул. Беларуская Краёвая Абарона.** [Аўстралія]: Беларускі Вызвольны Фронт, 1991. — 17 с.

Кароткі нарыс гісторыі БКА.

**65. Шнэк Ул. Другі Ўсебеларускі Кангрэс (рэфэрат).** Мэльбурн: Беларускі Вызвольны Фронт, 1991. — 13 с.

Значэньне Кангрэсу для гісторыі й сучаснасьці.

**66. Шнэк Ул. Слуцкае Паўстаньне 1920 году.** [Мэльбурн]: Беларускі Вызвольны Фронт, лістапад 1992. — 6 с.

**67. Biełaruskaja Narodnaja Respublika. Прэзыдэнт Беларускай Цэнтральнай Рады. Да Беларускага Грамадзтва!** Аўстралія, 21 лістапада 1992. — 1 p.

Подпісы: *«М. Зуй — прэзыдэнт, Віталі Цярпіцкі — сакратар»*.

**68. Biełaruskaja Narodnaja Respublika. Прэзыдэнт Беларускай Цэнтральнай Рады. «Дарагія Суродзічы...»** [Аўстралія] 1992. — 1 p.

Развагі пра зьмену сымболікі Рэспублікі Беларусь на Пагоню й белчырвона-белы сьцяг.

Подпісы: *«М. Зуй — прэзыдэнт, Віталі Цярпіцкі — сакратар»*.

**69. Зварот да Рады Міністраў і Вярхоўнага Савету Рэспублікі Беларусь.** Мэльбурн: Беларускі Вызвольны Фронт, 1993. — 3 с.

Зварот ад 29.11.1992 надрукаваны 10.03.1993.

**70. Шнэк Ул. Рэфэрат да 75-х угодкаў акту 25 сакавіка 1918 г.** Мэльбурн, 1993. — 7 с.

**71. Biełaruskaja Narodnaja Respublika. Прэзыдэнт Беларускай Цэнтральнай Рады. «Дарагія Суродзічы!»** [Аўстралія], 25 сакавіка 1993.

Пра палітычныя падзеі ў Беларусі.

Подпісы: *«М. Зуй — прэзыдэнт, Віталі Цярпіцкі — сакратар».*

**72. Belarusian Association of Australia. Press Statement.** Fairfield (N.S.W.), September 1995. — 2 p.

Прэс-рэліз: беларусы Аўстраліі крытыкуюць рэжым Лукашэнкі. Распаўсюджваўся ў Сыднэі. Подпіс: *«А. Алехнік».*

**73. Belarusian Songs (from South Australia. Neuschlesien).** Adelaide (SA), 1995. [14 p.]

Усе песьні музыкаў Міхася й Вольгі Бурносаў. На апошняй старонцы даецца кароткая гісторыя пасяленьня беларусаў у Паўднёвай Аўстраліі. У ангельскай мове.

**74. Belarusian Association of Australia. Press Statement on the situation in the Republic of Belarus.** Fairfield (N.S.W.), August 1996. — 3 p.

Паведамленьне для друку пра палітычнае становішча ў Беларусі. Подпіс: А. Алехнік.

**75. Virtual Guide to Belarus.** [Australia], 1996.

Пра Беларусь у Інтэрнэце. Падбор артыкулаў, статыстыка, сёньняшні стан.

**76. Kovalevski V. Belarusians in Adelaide.** Adelaide: Belarusian Association in South Australia, 2000. — 198 p.

Выданьне прысьвечанае памяці Янкі Ролсана. Збор твораў Янкі Ролсана; дакумэнты; успаміны пра пасяленьне беларусаў у Аўстраліі.

**77. Бурнос М. а., Кавалеўскі В. Беларуская эміграцыя ў Паўднёвай Аўстраліі.** Адэляйда: Беларускае Гістарычнае Згуртаваньне Аўстраліі, 2003. — 116 с.

**78. Кавалеўскі В. 25 год актыўнай працы Беларускага Аб'еднаньня ў Паўднёвай Аўстраліі.** Адэляйда, 2003. — 2 с.

Інфармацыйная ўлётка да юбілею арганізацыі, распаўсюджвалася сярод удзельнікаў сьвяткаваньня.

**79. Казка пра Чорта Лысага, Антыхрыста Вусатага і Вар'ята Чубатага.** Адэляйда: Беларускае Гістарычнае Згуртаваньне Аўстраліі, 2002. — 26 с.

Падрыхтавана да друку Віктарам Кавалеўскім, рэдактар айцец Міхась (Бурнос).

**80. Янка Ролсан і яго творы.** Адэляйда: Беларускае Гістарычнае Згуртаваньне Аўстраліі, 2003. — 144 с.

Збор твораў Янкі Ролсана. Падрыхтаваў да друку Віктар Кавалеўскі.



### Кнігі беларусаў Аўстраліі, выдадзеныя за межамі краіны

**Малецкі Я. Пад знакам Пагоні: Успаміны.** Таронта: Пагоня, 1976. — 198 с.

Назоў таксама ў ангельскай мове.

**Алехнік А. Пад бел-чырвона-белым (Memento patriam).** Вільня: Рунь, 1999. — 223 с.

Успаміны: жыцьцёвы шлях і палітычна-грамадзкая дзейнасьць беларускага дзеяча ў Аўстраліі.

**Шаўцоў С. Мая Адысея: Успаміны. Апавяданні. Вершы.** Вільня: Рунь, 1999. — 132 с.

Успаміны пра Бацькаўшчыну й эміграцыю беларускага грамадзка-палітычнага дзеяча ў Аўстраліі.

### Пэрыядычныя выданьні[3]

**1. Беларускі Праваслаўны Каляндар.** Мэльбурн: Выданьне парафіяльнай рады БАПЦ. 1960 — 1992 (апошні?).

Ад 1961 году назоў таксама па-ангельску: *Belorussian Orthodox Calendar.*

1962 — *«edited by Archimandrit Modest».*

1964 — *«edited by Rev. K. Alexander».*

1968 — *«edited by Very Rev. A. Kulakouski».*

1969 — *«апрацаваны Архімандрытам Мадэстам».*

1969 — *«edited by Rev. K. Alexander».*

**2. Вернік. Місіянэрскі лісток Аўстралійска-Н.Зэляндзкай Епархіі Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы.** Брысбэн: Брацтва Сьвятога Юрыя. Каляды 1957. Ведамы 1 нумар.

Выдавец, верагодна, архімандрыт Мадэст.

**3. Да Перамогі. Бюлетын Беларускае Народнае Грамады ў Аўстраліі.** Ньютаўн (Н.П.В.), 1955.

Выдавала рэдкалегія. На правах рукапісу. Ведамыя 2 нумары.

№ 1, студзень 1955.

№ 2, чэрвень 1955. Сыднэй. — Апошні ведамы нумар.

**4. Ёрш. Пэрыядычны часапіс сатыры і гумару.** Мэльбурн: Аддзел моладзі пры БВР [Беларускі Вызвольны Рух]. 1953—1956.

Рэдактар: Уладзімер Шнэк. Ведамыя 12 нумароў.

№ 1, чэрвень 1953. Год 1.

№ 2, ліпень 1953.

№ 3, жнівень 1953.

№ 4, верасень 1953.

№ 5, кастрычнік 1953.

---

[3] Паводле: Belarusian Publishing In The West: A Bibliography. Periodicals / Compiled by Vitaut Kipel and Zora Kipel. New York: Ross Publishing Inc. — 150 p.— З дадаткам некаторых пазыцыяў.

№ 6, лістапад 1953.
№ 7, сьнежань 1953.
№ 1 (8), студзень 1954. Год 2.
№ (9)—(12) выходзілі ў часопісе «На Варце» (№ 1—4, 1955—1956).

**5. Інфармацыйны Бюлетэнь.** [Мэльбурн], 1958.
Выдавец: Камітэт Набыцьця Беларускага Дому. Ведамы 1 нумар.
№ 1, [1958?].

**6. Інфармацыйны Бюлетэнь Беларусоў у Аўстраліі.** Сыднэй, 1952—1953.
Выдавец: Беларускае Аб’яднаньне ў Новай Паўднёвай Валіі. Рэдактары: Аляксандар Смаль, потым Міхась Лужынскі. Працяг часопіса «Новае Жыцьцё» пасьля № 10 (ліпень 1951 году). Ведамыя 3 нумары.
№ 11, ліпень—жнівень—верасень 1952. Год 3.
№ 12, кастрычнік—лістапад—сьнежань 1952. Год 3. — Назоў таксама ***The Byelorussian Information Bulletin.***
№ 13 (1), ліпень 1953. Год 4. — Апошні ведамы нумар.

**7. Інфармацыйны Бюлетэнь Фэдэральнай Рады Беларускіх Арганізацыяў у Аўстраліі. — The Federal Council of Byelorussian Organizations in Australia. Information Bulletin.** [Melbourne], 1983—1989.
Выдавец: Выканаўчы Камітэт ФРБАА. Тэксты ў беларускай і ангельскай мовах. Ведамыя 8 нумароў.
№ 1, 1983.
№ 2, 1984.
№ 3, 1984.
№ 4, [1985 — пачатак 1986?].
№ 5, [1986].
№ 6, [1987].
№ 7, [1988].
№ 8, [1989]. — Апошні ведамы нумар

**8. Інфармацыйны Ліст Беларускага Аб’еднаньня ў ПА Інк.** Адэляйда, 2001—2003.
Выдавец: управа Беларускага Аб’еднаньня ў Паўднёвай Аўстраліі. Рэдактар: Віктар Кавалеўскі. Ведамыя 7 нумароў (але без дакладнага пазначэньня парадкавага нумару кожнага).
[№ 1], кастрычнік 2001.
[№ 2], 6 сьнежня 2001.
[№ 3], 9 лютага 2002.
[№ 4], сакавік 2002.
[№ 5], лета(?) 2002.
[№ 6], 15 лютага 2003.
[№ 7], красавік 2003. — Апошні нумар. Выданьне спыніла існаваньне з жаданьня рэдактара.

**9. Łučnik. Orhan infarmacyji i łučnaści.** East Brisbane (Qld.), 1952—1956.



Выдавец: Задзіночаньне Беларускіх Вэтэранаў у Аўстраліі. Рэдактар Данат Яцкевіч. Выходзіў месячна ад студзеня 1952 да сакавіка 1953; пазьней двумесячна й радзей. Ведамыя 22 нумары.
№ 1, студзень 1952. Год 1.
Ад № 14, люты 1953. Год 2. — у якасьці выдаўца пазначана: *«Zadzinočańnie Biełaruskich Veteranaŭ u Aŭstraliji i N.-Zelandyiji»*.
№ 22, сакавік 1956. Год 5. — Месца выданьня *«Spotswood, Vic.»* — Апошні ведамы нумар.

**10. На Варце. Інфармацыйны часапіс Замежнага Прадстаўніцтва Беларускага Вызвольнага Руху.** [Мэльбурн]: Аддзел прэсы й прапаганды Замежнага Прадстаўніцтва Беларускага Вызвольнага Руху ў Аўстраліі, 1955—1956.
Выдаваўся квартальна на правах рукапісу. Рэдактар, верагодна, Уладзімер Шнэк. Ведамыя 4 нумары, якія адначасова зьмяшчаюць № (9)—(12) часопіса **«Ёрш»**
№ 1, [студзень—люты—сакавік 1955].
№ 2, красавік—травень—чэрвень 1955.
№ 3, ліпень—жнівень—верасень 1955. — Пазначаны як: *«Інфармацыйны часапіс БВФ [Беларускі Вызвольны Фронт]»*.
№ 4, студзень—люты—сакавік 1956. Год 2. — Апошні ведамы нумар.

**11. Наша Царква. Рэлігійна-Грамадзкі Часапіс Праваслаўных Беларусаў у Аўстраліі.** Baywater (Vic.), 1961—1962.
Выдавец: епархіяльная ўправа Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы ў Мэльбурне. Рэдактар, верагодна, архімандрыт Мадэст. Ведамыя 2 нумары.
[№ 1], 31 сьнежня 1961. — У нумары пазначана, што наступны выйдзе на Вялікдзень 1962 году.
[№ 2], 13 красавік 1962. — Апошні ведамы нумар.

**12. Новае Жыцьцё. Інфармацыйны Бюлетэнь Беларускага Аб’еднаньня ў Н.П.В. — The New Life. Information Bulletin of Byelorussian Association in N.S.W.** New Town—Sydney, 1951—1959.
У 1950—1951 гадах быў органам агульнай надпалітычнай арганізацыі беларусаў у Сыднэі. Рэдактар Уладзімер Клуніцкі. Выйшлі 10 нумароў.
№ 1, 25 сакавіка 1950. Год 1.
Ад № 3, чэрвень 1950. Год 1. — Як месца выданьня пазначаны толькі Сыднэй.
Ад № 7, сьнежань 1950 — студзень 1951. Год 2. — У зьвязку зь зьменай назову арганізацыі меў таксама падзагаловак: *«Інфармацыйны Бюлетэнь Беларускага Аб’еднаньня ў Аўстраліі»*.
№1 (8), люты 1951. Год 2.
№ 9, сакавік—красавік 1951. Год 2.
№ 10, ліпень 1951. Год 2. — Пасьля гэтага нумару працягваецца як **Інфармацыйны Бюлетэнь Беларусаў у Аўстраліі —** орган БЦРаў-

скага Беларускага Аб’еднаньня ў Аўстраліі. Пры канцы 1951 адбыўся арганізацыйны padзел. Група прыхільнікаў БЦР пераняла выданьне часопіса й працягвала нумарацыю пасьля № 7, сьнежань 1950 — студзень 1951, выключыўшы 3 нумары (№ 1 (8) — 10) з сваёй нумарацыі. Першыя некалькі гадоў часопіс выдаваўся ў Мэльбурне, дзе ў склад рэдакцыі ўваходзілі: Адам Жураўлевіч (галоўны рэдактар), Уладзімер Сідлярэвіч, Сяргей Розмысл, Міхась Шэка, Віктар Гладкі, Павал Гуз, Уладзімер Шнэк. Ад вяртаньня выданьня ў Сыднэй (блізу 1956—1957 гадоў) галоўным рэдактарам стаў Алесь Алехнік. Пасьля падзелу часопіса ў 1951 годзе выйшлі яшчэ 27 нумароў.

Ад № 8, лістапад 1951. Год 2. — Месца выданьня пазначанае як Сыднэй—Мэльбурн, а падзагаловак *«Інфармацыйны Бюлетэнь Беларускага Аб’еднаньня ў Аўстраліі».*

№ 9, сьнежань 1951. Год 2.

Ад № 10—11, студзень—люты 1952. Год 3. Месца выданьня: Мэльбурн—Сыднэй.

Ад № 1 (30), жнівень 1957. Год 8. — У якасьці выдавецтва й месца выданьня пазначана: Беларускае Аб’еднаньне ў Аўстраліі, Сыднэй. (Без падзагалоўка.)

№ 2 (34), ліпень 1959. Год 10. — Апошні ведамы нумар тагачаснага выданьня.

У 2003 годзе выданьне часопіса з назовам «Новае Жыцьцё» было адноўленае ў Адэляйдзе з ініцыятывы старшыні Беларускага Аб’еднаньня ў Паўднёвай Аўстраліі Віктара Кавалеўскага, але ня ў якасьці органа нейкай арганізацыі, а як культурна-гістарычны пэрыёдык. Да сярэдзіны 2004 году пабачылі сьвет 2 нумары адноўленага «Новага Жыцьця» (№ 2 і 3). Выданьне працягваецца.

**13. Праваслаўным Шляхам. — Orthodox Way.** Сэнт-Албанс (Вікторыя), 1964—1970.

Выдавец: Камітэт Беларускай Праваслаўнай Царквы ў Аўстраліі ў юрысдыкцыі Сусьветнага Патрыярхату. Рэдактар: архімандрыт Мадэст. Выходзіў тройчы на год: на Вялікдзень, Спас, Каляды. Ведамыя 19 нумароў.

№ 1, Каляды 1964, Год 1.

Ад № 3 (10), 1965. — Пазначана, што *«выдаецца вернікамі Беларускае Праваслаўнае Царквы ў Аўстраліі».*

№ 3 (19), Каляды 1970. — Апошні ведамы нумар.



# ХРАНАЛЁГІІ

## Кароткая храналёгія аўстралійскай гісторыі

**XVII ст.** — Экспэдыцыі галяндзкіх і ангельскіх мараплаўцаў да берагоў *terra australis incognita* й навакольных выспаў.

**1770 г.** — Высадка капітана Кука й каманды на караблі *Endeavour* («Спроба») на беразе Батанічнай затокі (усходняе ўзьбярэжжа Аўстраліі).

**26 студзеня 1788 г.** — Высадка першай флятыліі пад кіраўніцтвам капітана Артура Філіпа ў Сыднэйскай бухце й заснаваньне паселішча Сыднэй з 1500 каляністаў, асуджаных і паліцыянтаў. — Пачатак выкарыстаньня аўстралійскіх земляў як месца высылкі асуджаных. — Заснаваньне калёніі Новая Паўднёвая Валія.

**1803 г.** — Экспэдыцыя капітана Фліндэрса морам абышла берагі Аўстраліі й нанесла на мапу абрысы цэлага кантынэнту.

**1829 г.** — Уся Аўстралія абвешчаная тэрыторыяй Брытанскай Кароны.

**1834 г.** — Заснаваньне калёніі Паўднёвая Аўстралія.

**1850 г.** — Заснаваньне Сыднэйскага ўнівэрсытэту.

**1851 г.** — Аддзяленьне калёніі Вікторыя ад Новай Паўднёвай Валіі.

**50-я гг.** — «Залатая ліхаманка» ў Аўстраліі.

**1855 г.** — Пачатак дзеяньня новых канстытуцыяў у Новай Паўднёвай Валіі, Вікторыі, Паўднёвай Аўстраліі й Тасманіі. — Прыняцьце першага антыкітайскага закону.

**1859 г.** — Заснаваньне калёніі Квінслэнд.

**1885 г.** — Заснаваньне аўстралійскай Фэдэральнай Рады.

**1888 г.** — Міжкаляніяльная нарада па пытаньнях кітайскай іміграцыі.

**1898—1899 гг.** — Фэдэральныя рэфэрэндумы па пытаньнях прынцыпаў стварэньня Аўстралійскага Саюзу.

**1900 г.** — Разгляд канстытуцыі Аўстраліі ў брытанскім парлямэнце.

**9 траўня 1901 г.** — Пачатак працы першага парлямэнту Аўстралійскага Саюзу ў Мэльбурне.

**1902 г.** — Прыняцьце Закону аб абмежаваньні іміграцыі. Канчатковае афармленьне палітыкі «Белай Аўстраліі».

**1911 г.** — Заснаваньне Канбэры як сталіцы Аўстралійскага Саюзу.

**25 красавіка 1915 г.** — Высадка Аўстралійска-Новазэляндзкага армейскага корпусу (*ANZAC*) у Галіполі (Турцыя) у падтрымку Брытаніі ў Першай Сусьветнай вайне.

**1930 г.** — Прызначэньне першага народжанага ў Аўстраліі генэрал-губэрнатара.

**1939 г.** — Абвяшчэньне Аўстраліяй сьледам за Вялікай Брытаніяй вайны Нямеччыне.

**1940 г.** — Удзел аўстралійскіх войскаў у паўночнаафрыканскай кампаніі.

**1941 г.** — Зварот Аўстраліі да ЗША аб дапамозе ў вайне зь Японіяй і дазвол на разьмяшчэньне амэрыканскіх базаў на аўстралійскай тэрыторыі.

**1948 г**. — Пачатак новай іміграцыйнай палітыкі аўстралійскага ўраду — запрашэньне ўцекачоў з паваеннай Эўропы на кантрактную працу.

**1949 г.** — Пачатак будаўніцтва Сьнежнагорскай гідраэлектрасыстэмы з шырокім выкарыстаньнем працы эўрапейскіх імігрантаў.

**1950 г.** — Удзел аўстралійскіх войскаў у Карэйскай вайне.

**1950 г**. — Мінімальны заробак у краіне павялічаны да 1 фунта на тыдзень, а жаночая стаўка павялічаная да 75 адсоткаў ад мужчынскай.

**1952 г.** — Сьмерць ангельскага караля Георга VI.

**1953 г.** — Каранацыя каралевы Лізаветы II Ангельскай. — Заснаваньне аўстралійскай сыстэмы страхавой мэдыцыны.

**1954 г.** — Візыт каралевы Лізаветы II у Аўстралію (першы візыт каралевы на кантынэнт). — Адкрыцьцё першага прадпрыемства вытворчасьці ўрану ў Аўстраліі.

**1955 г.** — Абвяшчэньне Какосавых выспаў тэрыторыяй Аўстраліі.

**1956 г.** — Адкрыцьцё радовішчаў баксітаў у Квінслэндзе. — Пачатак працы тэлевізіі ў Сыднэі. — Алімпійскія гульні ў Мэльбурне.

**1957 г.** — Стандартызацыя шырыні чыгункі паміж Мэльбурнам і Албуры.

**1965 г.** — Увядзеньне аўстралійскіх войскаў у Віетнам на дапамогу ЗША.

**1967 г.** — Пастанова аб неабходнасьці наданьня абарыгенам поўных грамадзянскіх правоў, прынятае на агульнааўстралійскім рэфэрэндуме.

**1972 г.** — Першы лэйбарысцкі ўрад пад кіраўніцтвам Гога Вітлама ў аўстралійскай палітычнай гісторыі. — Абвяшчэньне палітыкі шматкультуралізму.

**1973 г.** — Адмаўленьне ад расавай і нацыянальнай дыскрымінацыі пры запрашэньні імігрантаў у краіну.

**1975 г.** — Увядзеньне новага іміграцыйнага закону, які павялічыў колькасьць некваліфікаваных рабочых, якім дазвалялася прыяжджаць у краіну.

**1975 г.** — Параза лэйбарыстаў на парлямэнцкіх выбарах і вяртаньне да ўлады лібэральна-нацыянальнай кааліцыі на чале з Малколмам Фрэйзэрам.

**1986 г.** — Абвяшчэньне аўстралійскага заканадаўства цалкам незалежным ад брытанскага парлямэнту й заканадаўчай сыстэмы.

**1992 г.** — Скасаваньне прысягі на вернасьць Брытанскай Кароне. — Курс лэйбарысцкага ўраду Пола Кітынга наператварэньне Аўстраліі ў рэспубліку й павелічэньне сувязяў з Азіяй.

**1998 г.** — Лібэральна-нацыянальны кааліцыйны ўрад Джона Говарда.



**1999 г.** — Рэфэрэндум наконт пазбаўленьня ангельскай каралевы намінальнага статусу кіраўніцы дзяржавы й увядзеньня ў Аўстраліі пасады прэзыдэнта, які абіраецца парлямэнтам, зацьвердзіў наяўныя правы каралевы.

**2000 г.** — Алімпійскія гульні ў Сыднэі.

### Асноўныя моманты гісторыі беларусаў у Аўстраліі

**1696 г**. — Удзел колькіх грамадзянаў Рэчы Паспалітай у экспэдыцыі галяндзкага капітана Вілема Вламінга, які дасьледаваў берагі сучаснай Заходняй Аўстраліі.

**1785—1791 гг.** — Падарожжа Ксавэрыя Карніцкага з Паўднёвай Амэрыкі да берагоў Аўстраліі.

**1803 г.** — Прыбыцьцё на выспу Тасманія Яна Патоцкага, асуджанага ангельскім судом.

**1839—1844 гг.** — Досьледы Паўла Эдмунда Стжэлецкага ў Аўстралійскіх Альпах, падчас якіх была адкрытая й гара Касьцюшкі, а таксама знойдзеныя радовішчы вугалю й золата.

**1838 г.** — Переезд у Сыднэй удзельніка паўстаньня 1830—1831 гадоў Алёіза Канстантага Друцкага-Любецкага, нашчадка ведамага шляхецкага роду.

**1840 г.** — Переезд у Аўстралію Люцыяна й Фэрдынанда Плятэраў, удзельнікаў паўстаньня 1830—1831 гадоў, дзяцей маршалка віленскай шляхты Тадэвуша Плятэра й пляменьніцы Тадэвуша Касьцюшкі Рахелы.

**60—70-я гг. XIX ст.** — Прыезд у Аўстралію некаторых удзельнікаў паўстаньня 1863 году.

**20—30-я гг. XX ст.** — Прыбыцьцё ў Аўстралію (часта праз Кітай) выхадцаў зь беларускіх земляў, што пакінулі радзіму ў часе бальшавіцкай рэвалюцыі.

**15 траўня 1948 г.** — Прыбыцьцё ў Сыднэй першай групы беларусаў (33 асобы).

**1948 г.** — Заснаваньне ў лягерах двух часовых беларускіх камітэтаў.

**28—29 траўня 1949 г.** — Выстава нацыянальных ручных вырабаў у Канбэры, дзе беларускі стэнд прыцягнуў увагу міністра іміграцыі Артура Калвэла й прычыніўся да афіцыйнага дазволу на больш шырокае запрашэньне беларусаў у Аўстралію.

**1950 г.** — Пачатак працы Беларускага Клюбу на чале з Аляксандрам Калодкам у Мэльбурне.

**1950 г.** — Арганізацыя беларускага скаўцкага зьвязу «Ўсяслаў Чарадзей» у Мэльбурне.

**7 студзеня 1950 г.** — Пачатак працы першага Беларускага Клюбу ў Сыднэі.

**28 студзеня 1950 г.** — Арганізацыйны сход Беларускага Аб’яднаньня ў Новай Паўднёвай Валіі, арганізацыі беларусаў бяз розьніцы палітычных поглядаў.

**Люты 1950 г. —** Першая неафіцыйная сустрэча беларускага актыву Адэляйды на чале з айцом Міхалам (Шчурко).

**Сакавік 1950 г.** — Выхад першага нумару часопіса «Новае Жыцьцё» ў Сыднэі.

**25 сакавіка 1950 г.** — Легалізацыя Міністэрствам Іміграцыі першага аддзелу Задзіночаньня Беларускіх Вэтэранаў у Брысбэне й Беларускага Аб'еднаньня ў Новай Паўднёвай Валіі (Сыднэй), а таксама першае сьвяткаваньне ўгодкаў незалежнасьці Беларусі на аўстралійскай зямлі (у Мэльбурне, Сыднэі, Брысбэне)[4].

**27 сакавіка — 1 красавіка 1950 г.** — Выстава мастацтва новых аўстралійцаў, у якой бралі ўдзел беларусы Сыднэю.

**Травень 1950 г.** — Заснаваньне Беларускага Аб'еднаньня ў Вікторыі.

**Кастрычнік 1950 г.** — Зьмена назову Беларускага Аб'еднаньня ў Новай Паўднёвай Валіі на Беларускае Аб'еднаньне ў Аўстраліі, з двума аддзеламі ў Вікторыі й Новай Паўднёвай Валіі.

**Студзень 1951 г.** — Удзел беларускай калёны ў дэманстрацыі з нагоды 50-годзьдзя Аўстралійскага Саюзу ў Сыднэі.

**21—27 студзеня 1951 г.** — Беларускі аддзел на міжнацыянальнай выставе ручных вырабаў новае эміграцыі ў Канбэры.

**12—17 сакавіка 1951 г.** — Беларускія экспанаты й інфармацыйная брашура пра Беларусь на выставе ручных вырабаў новае эміграцыі ў Брысбэне.

**25 сакавіка 1951 г.** — Аддзяленьне прыхільнікаў Рады БНР ад агульнай арганізацыі ў Сыднэі й стварэньне асобнага Беларускага Аб'еднаньня ў Новай Паўднёвай Валіі. Прыхільнікі БЦР засталіся ў Беларускім Аб'еднаньні ў Аўстраліі.

**1 ліпеня 1951 г.** — Стварэньне будаўлянай групы ўзаемадапамогі беларусаў у Мэльбурне.

**9 ліпеня 1951 г.** — Афіцыйная рэгістрацыя БАПЦ у Паўднёвай Аўстраліі.

**Лістапад 1951 г.** — Перадача справы выданьня часопіса «Новае Жыцьцё» БЦРаўскай рэдакцыі ў Мэльбурн.

**1952 г.** — Заснаваньне Каардынацыйнага Камітэту Беларускіх Арганізацыяў у Аўстраліі, што аб'ядноўваў суполкі прыхільнікаў Рады БНР у Мэльбурне й Сыднэі.

**1952 г. —** Заснаваньне Згуртаваньня Беларускіх Жанчын з галоўнай управай у Брысбэне.

**Студзень 1952 г. —** Пачатак выданьня Інфармацыйнага Бюлетэня Задзіночаньня Беларускіх Вэтэранаў «Łučnik» у Брысбэне.

**6 студзеня 1952 г.** — Заснаваньне аддзелу Задзіночаньня Беларускіх Вэтэранаў у Заходняй Аўстраліі.

[4] Ад гэтага часу сьвяткаваньні 25 Сакавіка, таксама як і гадавінаў Слуцкага паўстаньня ды іншых сьвятаў, сталі рэгулярнымі ў беларускіх асяродках і далей асобна не пазначаюцца ў храналёгіі.



**Сакавік 1952 г.** — Канчатковы разрыў паміж прыхільнікамі БЦР (БАА) і Рады БНР (БАНПВ) у Сыднэі й курс на самастойную дзейнасьць арганізацыяў адпаведных палітычных кірункаў.

**Красавік 1952 г.** — Заснаваньне Згуртаваньня Беларусаў у Вікторыі, арганізацыі прыхільнікаў Рады БНР.

**Ліпень 1952 г**. — Атрыманьне дазволу БАПЦ у Сыднэі на набажэнствы, якія сталі адбывацца з удзелам архіяпіскапа Сяргея ў англіканскай царкве.

**18 ліпеня 1952 г.** — Першая лекцыя з цыклю заплянаваных агульнаасьветных і беларусаведных лекцыяў, ладжаных Згуртаваньнем Беларусаў у Вікторыі.

**1953 г.** — Пачатак дзейнасьці ўласнай друкарні Задзіночаньня Беларускіх Вэтэранаў у Брысбэне.

**3 і 19 красавіка 1953 г.** — Канцэрты беларускай песьні на радыёстанцыі *6WN* у Пэрце.

**5, 6 і 24 траўня 1953 г.** — Паўгадзінныя праграмы аб Беларусі й канцэрт беларускіх песень на радыёстанцыі *4KQ* у Брысбэне.

**Чэрвень 1953 г.** — Пачатак выхаду беларускага пэрыядычнага часопіса сатыры й гумару «Ёрш» у Мэльбурне.

**26—30 кастрычніка 1953 г.** — Удзел беларусаў Пэрту ў міжнацыянальнай мастацкай выставе.

**1954 г. —** Удзел беларусаў Сыднэю ў падрыхтоўцы адмысловага шматнацыянальнага прывітаньня для каралевы Лізаветы II ад новых аўстралійцаў у часе яе візыту.

**26 студзеня 1954 г.** — Удзел беларускага прадстаўніка Алеся Алехніка ў Грамадзянскім Сходзе прадстаўнікоў нацыянальных групаў і ўладаў, прысьвечаным праблемам імігрантаў у Аўстраліі, што адбыўся ў Канбэры.

**Сакавік 1954 г.** — Значак «Дар Сакавіка» выдадзены Задзіночаньнем Беларускіх Вэтэранаў у Брысбэне.

**9 красавіка 1954 г.** — Удзел беларускай дэлегацыі ў складзе Алеся Алехніка й Міхася Зуя ў якасьці назіральнікаў абсэрватара на сэсіі аўстралійскага парлямэнту.

**9—22 жніўня 1954 г.** — Беларускі аддзел на выставе мастацтва й ручных вырабаў новых аўстралійцаў у Пэрце.

**1955 г.** — Заснаваньне ў Сыднэі беларускага мяшанага хору пад кіраўніцтвам С. Анічкава.

**13 лістапада 1955 г.** — Пачатак працы беларускай школы ў Сэнт-Албансе (Мэльбурн).

**27 лістапада 1955 г. —** Супольнае сьвяткаваньне ўгодкаў Слуцкага паўстаньня ўсімі беларускімі арганізацыямі Мэльбурну бяз розьніцы палітычных перакананьняў.

**27 траўня—10 ліпеня 1956 г.** — Побыт архіяпіскапа Сяргея ў Пэрце, у часе якога тут створаная парафія Жыровіцкай Божай Маці й пастаноўлена пабудаваць уласную царкву.

**26 ліпеня 1956 г.** — Удзел беларускай дэлегацыі ў складзе Алеся Алехніка, Міхася Зуя, Усевалада Родзевіча ў Другім Грамадзянскім

Сходзе прадстаўнікоў нацыянальных групаў і ўладаў, прысьвечаным праблемам імігрантаў у Аўстраліі, што адбыўся ў Сыднэі.

**28 ліпеня 1956 г.** — Заснаваньне самастойнага Задзіночаньня Беларускіх Вэтэранаў у Заходняй Аўстраліі, не падпарадкаванага ўправе ў Брысбэне.

**12 жніўня 1956 г.** — Сход беларускага актыву Мэльбурну ў справе набыцьця Беларускага Дому, заснаваньне адмысловага Камітэту.

**4 лістапада 1956 г.** — Удзел беларусаў у антыкамуністычных маніфэстацыях, што адбываліся ў розных гарадах з нагоды вугорскіх падзеяў і ладзіліся Камітэтам Народаў з-за Жалезнай Заслоны.

**7 ліпеня 1957 г.** — Нарада беларусаў Мэльбурну з удзелам архімандрыта Мадэста, якая пастанавіла зарганізаваць тут парафію БАПЦ.

**22 чэрвеня 1958 г.** — Першае набажэнства парафіі Трох Віленскіх Пакутнікаў БАПЦ у Мэльбурне.

**1958 г.** — Набыцьцё пляцу зямлі для пабудовы беларускай царквы ў Адэляйдзе.

**1959 г.** — Заснаваньне бібліятэчкі пры Згуртаваньні Беларусаў у Вікторыі.

**Чэрвень 1960 г.** — 22 лекцыі зь беларускай гісторыі, прачытаныя Аляй Яцкевіч у дзявочым коледжы Калюмбус у Мэльбурне.

**25—26 сьнежня 1960 г.** — II Епархіяльны зьезд БАПЦ у Аўстраліі, які адбыўся ў Адэляйдзе з удзелам прадстаўнікоў беларускіх сьвецкіх арганізацыяў і парафіяў БАПЦ.

**Сьнежань 1961 г.** — Выхад першага нумару часопіса «Наша Царква» ў Мэльбурне.

**2 ліпеня 1961 г.** — Стварэньне Камітэту Ладжаньня Супольных Сьвяткаваньняў на агульным сходзе беларусаў Мэльбурну розных палітычных кірункаў.

**22—29 кастрычніка 1961 г.** — Удзел беларусаў у мерапрыемствах Тыдня Паняволеных Народаў у Вікторыі.

**1962 г.** — Адлучэньне архімандрыта Мадэста ад БАПЦ і арганізацыя ім у Мэльбурне парафіі Сьвятой Эўфрасіньні Полацкай у юрысдыкцыі Сусьветнага Патрыярхату.

**1963 г.** — Афіцыйная рэгістрацыя парафіі Трох Віленскіх Пакутнікаў у Мэльбурне, ажыцьцёўленая айцом Аляксандрам (Кулакоўскім).

**1963 г.** — Заснаваньне Беларускага Цэнтральнага Камітэту ў Вікторыі, агульнай арганізацыі беларусаў розных палітычных кірункаў.

**29 сьнежня 1963 г. —** Урачыстае высьвячэньне беларускай царквы ў Адэляйдзе архіяпіскапам Сяргеем.

**Студзень 1964 г. —** Выхад першага нумару часопіса «Праваслаўным Шляхам» у Мэльбурне.

**1968 г. —** Набыцьцё зямельнага надзелу для беларускай сэкцыі на могільніку Фоўкнэр у Мэльбурне.

**1968 г. —** Часовы пераход беларускай парафіі Сьвятых Апосталаў Пятра й Паўла ў Адэляйдзе ў юрысдыкцыю УАПЦ.



**15 лютага й 10 сакавіка 1968 г.** — Хіратоніі беларускіх япіскапаў Андрэя (Крыта) і Мікалая (Мацукевіча) архіяпіскапам Сяргеем у Адэляйдзе.

**30 сакавіка 1968 г.** — Урачыстае адкрыцьцё Беларускага Народнага Дому ў Пэрце.

**4—22 жніўня 1968 г.** — Побыт уладыкі Часлава Сіповіча ў Аўстраліі (Сыднэй і Мэльбурн).

**18 траўня 1969 г.** — Сход беларусаў Сыднэю, на якім агучаная ідэя стварэньня агульнага для ўсіх Беларускага Культурна-Грамадзкага Клюбу.

**2 і 9 жніўня 1970 г.** — Бацькоўскія сходы ў Мэльбурне ў справе арганізацыі новай беларускай школы.

**30 траўня 1971 г.** — Арганізацыйны сход беларускай моладзі ў Мэльбурне, спроба стварэньня адмысловай арганізацыі — Саюзу Беларускай Моладзі.

**1972 г. —** Адкрыцьцё Беларускага Дому ў Мэльбурне.

**10 верасьня 1972 г.** — Арганізацыйны сход Беларускага Жаночага Камітэту ў Вікторыі.

**11 кастрычніка — 12 лістапада 1971 г.** — Побыт уладыкі Мікалая ў Аўстраліі, удзел у пахаваньні ўладыкі Сяргея ў Адэляйдзе, вяртаньне мясцовай парафіі Сьвятых Апосталаў Пятра й Паўла ў юрысдыкцыю БАПЦ, наведваньне Мэльбурну й Сыднэю.

**14 сьнежня 1973 г.** — Афіцыйная рэгістрацыя Беларускага Культурна-Грамадзкага Клюбу ў Сыднэі з уласным памяшканьнем у раёне Файрфілд.

**Сакавік 1976 г.** — Выхад першай беларускай праграмы на этнічным радыё *3ZZ* у Мэльбурне.

**20 ліпеня 1976 г. —** Выхад першай беларускай праграмы на этнічным радыё *2EA* ў Сыднэі.

**27 лістапада 1976 г. —** Урачыстае высьвячэньне Помніку *«На вечны ўспамін спачылых усіх ведамых і няведамых Беларусаў»* на беларускай дзялянцы могільніку Фоўкнэр у Мэльбурне.

**31 сьнежня 1976 г. — 3 студзеня 1977 г. —** Першая Сустрэча Беларусаў Аўстраліі ў Мэльбурне. Заснаваньне Фэдэральнай Рады Беларускіх Арганізацыяў у Аўстраліі.

**1977 г. —** Заснаваньне Беларускага Аб’еднаньня ў Паўднёвай Аўстраліі.

**6 студзеня 1977 г.** — Беларуская куцьця ў Адэляйдзе[5].

**Травень 1977 г.** — Удзел прадстаўнікоў беларусаў (спадарстваў Качан і Лужынскіх) у першым балі этнічнага радыё ў Сыднэі.

**1 ліпеня 1977 г.** — Спыненьне дзейнасьці беларускай рэдакцыі радыё ў Мэльбурне.

[5] Ад гэтага часу куцьця стала традыцыйным мерапрыемствам беларусаў Адэляйды й праводзілася штогод.

**20—22 ліпеня 1977 г.** — Беларуская выстава ў Мэльбурне ў межах мерапрыемстваў Тыдня Паняволеных Народаў.

**1977 г.** — Удзел беларусаў Сыднэю ва ўсталяваньні Помніку Эмігрантам у раёне Файрфілд, зь зьмяшчэньнем на ім бел-чырвона-белага сьцягу й Пагоні.

**1—9 кастрычніка 1977 г.** — Удзел беларусаў Сыднэю ў тыдні этнічных культураў «Караван-77», у межах якога была арганізаваная беларуская выстава.

**29 сьнежня 1977 г. — 2 студзеня 1978 г. —** Другая Сустрэча Беларусаў Аўстраліі ў Сыднэі.

**Сакавік 1978 г.** — Зьезд аўстралійскай Фэдэральнай Рады Паняволеных Народаў, сакратаром якой абраная Надзея Груша.

***Жнівень* — верасень 1978 г. —** Побыт архіяпіскапа Мікалая ў Мэльбурне й Сыднэі.

**5—9 студзеня 1979 г. —** Трэцяя Сустрэча Беларусаў Аўстраліі ў Адэляйдзе.

**14 і 19 верасьня 1979 г.** — Удзел беларускай танцавальнай групы «Лявоніха» ў здымках перадачы пра Беларусь на аўстралійскай тэлевізіі.

**Канец 1979 г.** — Удзел беларусаў у антыбальшавіцкіх дэманстрацыях у розных гарадах Аўстраліі.

**27—29 сьнежня 1980 г. —** Чацьвертая Сустрэча Беларусаў Аўстраліі ў Мэльбурне.

**1981 г. —** Набыцьцё ўласнага будынку царквы парафіяй Трох Віленскіх Пакутнікаў у Мэльбурне.

**29 сьнежня 1982 г. — 2 студзеня 1983 г. —** Пятая Сустрэча Беларусаў Аўстраліі ў Сыднэі.

**1983 г.** — Выхад першага нумару Інфармацыйнага Бюлетэня Фэдэральнай Рады Беларускіх Арганізацыяў у Аўстраліі.

**Сакавік — красавік 1984 г.** — Беларуская этнаграфічная выстава ў памяшканьні Этнаграфічнага цэнтру Адэляйды, ладжаная Беларускім Аб’еднаньнем у Паўднёвай Аўстраліі.

**Вясна 1984 г.** — Удзел беларускіх юнакоў у канцэрце, ладжаным Камітэтам Этнічных Групаў у Адэляйдзе.

**4 сакавіка 1984 г**. — Першая беларуская праграма на радыё *6NR* у Пэрце.

**5—9 студзеня 1985 г. —** Шостая Сустрэча Беларусаў Аўстраліі ў Адэляйдзе.

**21 траўня 1986 г.** — Пасадка дрэваў недалёка ад беларускае царквы ў раёне Гайндмарш Адэляйды з ініцыятывы Беларускага Аб’еднаньня ў Паўднёвай Аўстраліі ў межах сьвяткаваньня 150-годзьдзя Адэляйды.

**17 лістапада 1986 г.** — Урачыстае адкрыцьцё выставы «Беларусь і ейныя кнігі» ў Монаскім унівэрсытэце Мэльбурну.

**6—10 студзеня 1987 г.** — Сёмая Сустрэча Беларусаў Аўстраліі ў Мэльбурне.



**13 лютага — 3 красавіка 1988 г**. — Беларуская выстава ў Этнічным музэі Адэляйды, ладжаная Беларускім Аб’еднаньнем у Паўднёвай Аўстраліі.

**Сакавік — чэрвень 1988 г.** — Урачыстыя набажэнствы з нагоды 1000-годзьдзя хрысьціянства ў парафіях БАПЦ Мэльбурну й Адэляйды.

**24 кастрычніка 1988 г.** — Удзел сяброў Беларускага Аб’еднаньня ў Заходняй Аўстраліі ва ўрачыстым паходзе ў Пэрце з нагоды 43-х угодкаў стварэньня ААН.

**Студзень 1989 г. —** Восьмая Сустрэча Беларусаў Аўстраліі ў Сыднэі.

**16 ліпеня 1989 г.** — Удзел сяброў Беларускага Аб’еднаньня ў Заходняй Аўстраліі (спадарства Раецкіх) у сустрэчы прадстаўнікоў этнічных групаў з прэм’ер-міністрам Аўстраліі Робэртам Гокам у Пэрце.

**1989 г.** — Фэдэральная Рада Беларускіх Арганізацыяў у Аўстраліі стварыла Камітэт дапамогі ахвярам Чарнобылю й пачала збор сродкаў.

**1990 г.** — Прыезд у Пэрт беларускага сьвятара айца Ўладзімера (Зайкі) і аднаўленьне тут рэлігійнага жыцьця.

**6—10 студзеня 1991 г. —** Дзявятая Сустрэча Беларусаў Аўстраліі ў Адэляйдзе.

**2 лістапада 1991 г.** — Выступ беларускай групы «Каліна» на Міжнародным фэстывалі музыкі й танцаў у Ланкэстон (Тасманія).

**1992 г.** — Беларускія экспанаты на міжнароднай выставе банкнотаў, каштоўных знакаў і купонаў у Сыднэі.

**1992 г.** — Дабрачынны канцэрт беларускай групы «Каліна» з мэтай збору сродкаў у Чарнобыльскі фонд.

**14 лютага 1992 г. —** Набыцьцё зямлі для беларускай сэкцыі на могільніку Караката ў Пэрце.

**16 лютага 1992 г. —** Выхад Беларускага Культурна-Грамадзкага Клюбу ў Сыднэі зь сяброўства ў ФРБАА.

**19—21 студзеня 1993 г.** —Дзясяты Зьезд прадстаўнікоў беларускіх арганізацыяў (Выканаўчага Камітэту ФРБАА) у Мэльбурне. Збор сродкаў ахвярам Чарнобылю.

**18 красавіка 1993 г.** — Урачыстае адкрыцьцё хастэля (дома для сталых асобаў) Сьвятой Ганны ў Адэляйдзе, пабудаванага з ініцыятывы беларусаў, украінцаў і харватаў.

**21 студзеня 1995 г.** — Адзінаццаты Зьезд прадстаўнікоў беларускіх арганізацыяў (Выканаўчага Камітэту ФРБАА) у Сыднэі.

**13—17 студзеня 1997 г.** — Дванаццаты Зьезд прадстаўнікоў беларускіх арганізацыяў (Выканаўчага Камітэту ФРБАА) у Адэляйдзе.

**1999 г.** — Стварэньне Беларускага Гістарычнага Згуртаваньня Аўстраліі.

**23—26 сакавіка 2001 г.** — Трынаццаты Зьезд прадстаўнікоў беларускіх арганізацыяў (Выканаўчага Камітэту ФРБАА) у Мэльбурне.

## БІЯГРАФІЧНЫ СЛОЎНІК[6]

**Акавіты Ўладзімер** (нар. 20.10.1925). Паходзіць з Косава (цяпер Івацэвіцкі раён Брэсцкай вобласьці). Вучыўся ў мясцовай рамеснай школе. Падчас нямецкае акупацыі служыў у беларускай паліцыі. Летам 1944 году выехаў на Захад. Па капітуляцыі Нямеччыны апынуўся ў француcкай зоне акупацыі, быў камэндантам лягеру для перамешчаных асобаў. У 1949 годзе выехаў у Аўстралію. Працаваў па кантракце на высьпе Тасманія, затым пасяліўся ў Адэляйдзе, дзе актыўна далучыўся да справы пабудовы беларускай царквы й наладжваньня беларускага рэлігійна-грамадзкага жыцьця. Доўгагадовы сябра парафіяльнай рады царквы Сьвятых Апосталаў Пятра й Паўла. Браў удзел у дзейнасьці Беларускага Аб'яднаньня ў Паўднёвай Аўстраліі, у якім у розныя гады займаў пасады сакратара, «паблік афіцэра». Аўтар зацемак пра жыцьцё беларусаў у Адэляйдзе на старонках газэты «Беларус».

**Алехнік Алесь** (нар. 31.07.1929). Нарадзіўся на хутары ва ўрочышчы Перунова, блізу в. Лахва (цяпер Лунінецкі раён Брэсцкай вобласьці), у сялянскай сям'і. Вучыўся ў Перуноўскай школе й польскай гімназіі ў Лахве. У 1944 годзе разам зь сям'ёй выехаў у Нямеччыну, дзе жыў у лягеры Ізармос блізу Дынгольфінгу, працаваў на заводзе. Па сканчэньні Другой Сусьветнай вайны вучыўся на каморніцкіх курсах у Мюнхене. У 1947 годзе перабраўся ў беларускі лягер Міхельсдорф. У сьнежні 1950 году прыехаў у Аўстралію (Сыднэй). Працаваў на пабудове Сьнежнагорскай гідраэлектрасыстэмы. Хутка далучыўся да беларускага грамадзкага жыцьця. Сябра й доўгагадовы сакратар Беларускага Аб'яднаньня ў Аўстраліі, ад імя якога выступаў на разнастайных міжнацыянальных форумах у Аўстраліі (удзельнічаў у двух агульнааўстралійскіх Грамадзянскіх Сходах, быў назіральнікам у парлямэнце й г.д.) і па-за яе межамі (на канфэрэнцыях Антыкамуністычнай Лігі Народаў Азіі й Сусьветнай Антыкамуністычнай Лігі). Пры канцы 50-х гадоў займаўся выданьнем Інфармацыйнага Бюлетэня Беларускага Аб'яднаньня ў Аўстраліі «Новае Жыцьцё». У 1969—1982 гадах — кіраўнік Краёвага Штабу Беларускага Вызвольнага Фронту ў Аўстраліі. Аўтар кнігі ўспамінаў «Пад бел-чырвона-белым» (Вільня, 1999). Ягоны архіў, у які ўвайшлі дакумэнты Беларускага Аб'яднаньня ў Аўстраліі й шматлікае ліставаньне, якое Алесь Алехнік вёў як сакратар арганізацыі, перахоўваецца ў Беларускім дзяржаўным архіве-музэі літаратуры й мастацтва (Менск).

[6] Біяграфічны слоўнік ня ёсьць поўны. Асобы, прыведзеныя ў ім, адбіраліся згодна зь іх вагою ў грамадзкім жыцьці Беларускай Аўстраліі, а таксама з улікам наяўнага біяграфічнага матэрыялу, у які ўваходзілі знойдзеныя друкаваныя зьвесткі пра асобу, матэрыялы аўстралійскіх архіваў у Інтэрнэце ды сьведчаньні іншых беларусаў, запісаныя ў часе асабістых сустрэчаў або дасланыя лістамі. За дапамогу ў падрыхтоўцы біяграфічнага слоўніку асаблівая падзяка належыць Аўгену Грушу, Алегу Шнэку, Міхасю Лужынскаму.



**Антух Мікола** (нар. 2.03.1924). Нарадзіўся ў Паставах (сёньня Віцебская вобласьць) у заможнай сялянскай сям'і, якая гадавала коні для польскага войску. Падчас вайны апынуўся ў Нямеччыне, дзе вучыўся ў гімназіі ў польскім лягеры блізу Мюнхену. У 1949 годзе прыехаў у Аўстралію, дзе спачатку працаваў на прадпрыемстве *Good Year*, а пазьней зрабіў пасьпяховую кар'еру ў сфэры нерухомасьці. Ад сярэдзіны 50-х гадоў браў удзел у беларускім грамадзкім жыцьці Сыднэю. Быў сябрам Беларускага Аб'яднаньня ў Аўстраліі. Пазьней блізу году кіраваў арганізацыяй «незалежнікаў». Адзін з ініцыятараў аб'яднаньня беларускіх арганізацыяў дзеля набыцьця ўласнага грамадзкага цэнтру. Першы старшыня (1973—1975) Беларускага Культурна-Грамадзкага Клюбу й пасьля нязьменны сябра ўправы ды адзін з найбольш актыўных удзельнікаў.

**Ахатэнка Ягор, арх. Сяргей** (12.03.1890 — 2.10.1971). Нарадзіўся ў в. Малыя Гарошкі ў Жытомірскім павеце (Украіна) у сялянскай сям'і. У 1911—1921 гадах — у Богаяўленскім манастыры ў Жытоміры, дзе ў 1919 годзе прыняў манаскі сан. У 1925 годзе высьвячаны на субдыякана, а ў 1932 годзе — на архімандрыта. Працаваў у праваслаўных парафіях ва Ўкраіне, пакуль у 1937 годзе ня быў арыштаваны савецкімі ўладамі. Вызвалены ў 1941 годзе. На Кіраваградзкім Катэдральным Саборы (1.08.1943) высьвячаны ў япіскапы. Ад лета 1944 году — у Нямеччыне. Удзельнік Першага Сабору БАПЦ у Канстанцы (4—5.06.1948), на якім быў прызнаны архіяпіскапам і ўвайшоў у Часовую Раду БАПЦ. У 1950 годзе пераехаў у Аўстралію. Кіраўнік БАПЦ на Аўстралію й Новую Зэляндыю. Да 1957 году жыў у Сыднэі. Потым перабраўся ў Пэрт, дзе прычыніўся да збору сродкаў на пабудову беларускай царквы, а пазьней — у Адэляйду, дзе абслугоўваў некалькі грэцкіх парафіяў. Пахаваны на грэцкіх могілках у Адэляйдзе.

**Бакуновіч Аляксандар** (нар. 23.12.1918). Брат Мітрафана, Уладзімера й Лізы Бакуновічаў. Нарадзіўся ў в. Малыя Сьцяблевічы Лунінецкага павету (цяпер Жыткавіцкі раён Гомельскай вобласьці) у заможнай сялянскай сям'і. Ад 1944 году — у Нямеччыне, дзе па сканчэньні Другой Сусьветнай вайны жыў зь сям'ёй у беларускіх лягерах Рэгенсбург, Міхельсдорф, Віндышбэргердорф. Ад 1950 году — у Аўстраліі. Радны БНР. Ад 1973 году — у Беларускім Культурна-Грамадзкім Клюбе, у якім цягам 17 гадоў працаваў на пасадзе скарбніка.

**Бакуновіч Мітрафан** (нар. 20.06.1921). Брат Аляксандра, Уладзімера й Лізы Бакуновічаў. Ад 1944 году — у Нямеччыне, дзе па сканчэньні Другой Сусьветнай вайны жыў зь сям'ёй у беларускіх лягерах Рэгенсбург, Міхельсдорф, Віндышбэргердорф. Ад 1950 году — у Аўстраліі. Сябра Беларускага Аб'яднаньня ў Новай Паўднёвай Валіі й ягоны скарбнік. Доўгі час быў адным з дырэктараў Беларускага Культурна-Грамадзкага Клюбу ў Сыднэі.

**Бакуновіч Уладзімер** (10.12.1926 — 23.05.1992). Брат Аляксандра, Мітрафана й Лізы Бакуновічаў. Вучыўся ў польскай і савецкай школах. Ад 1944 году — у Нямеччыне, дзе да канца Другой Сусьвет-

най вайны працаваў у баўэра, а потым вучыўся ў гімназіі імя Янкі Купалы ў беларускіх лягерах у Рэгенсбургу й Віндышбэргердорфе. У 1950 годзе разам з бацькамі, братамі й сястрой выехаў у Аўстралію. У Сыднэі браў удзел у арганізацыі Беларускага Аб’еднаньня ў Новай Паўднёвай Валіі. Пазьней апублікаваў на старонках газэты «Бацькаўшчына» нататкі пра першыя гады беларускай прысутнасьці на пятым кантынэнце. У 1954 годзе паступіў на эканамічны факультэт Лювэнскага ўнівэрсытэту ў Бэльгіі, дзе ў 1963 годзе атрымаў тытул доктара эканомікі. Пазьней пераехаў у ЗША. Жыў у Нью-Брансьвіку (штат Нью-Джэрзі), а ад 1968 году — у Дэтройце (штат Мічыган), дзе працаваў як спэцыяліст у падатковых справах. Актыўны ўдзельнік Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня й Рады БНР.

**Бакуновіч—Грыцай Ліза** (нар. 11.11.1936). Сястра Аляксандра, Мітрафана й Уладзімера Бакуновічаў. У часе Другой Сусьветнай вайны разам зь сям’ёй апынулася ў Нямеччыне. Пасьля капітуляцыі ў беларускіх лягерах Рэгенсбургу, Міхельсдорфе, Віндышбэргердорфе вучылася ў беларускай пачатковай школе й гімназіі імя Янкі Купалы. Ад 1950 году — у Аўстраліі. У 1958 годзе пабралася шлюбам зь першым мужам (баўгарынам), зь якім мае сына й дачку, але па нейкім часе ўзяла развод. У 1974 годзе выйшла замуж другі раз за ўкраінца Якава Грыцая. Ад 1989 году — удава. Ад самога пачатку дзейнасьці Беларускага Культурна-Грамадзкага Клюбу была ягонай сяброўкай. Актыўна ўдзельнічала ў працы Жаночага Камітэту.

**Бразоўскі Анатоль** (нар. 21.07.1918). Вучыўся на мэдычным факультэце Віленскага ўнівэрсытэту, завяршыў адукацыю ў Нямеччыне. Ад 1949 году — у Аўстраліі. Пасяліўся ў Пэрце, здолеў пацьвердзіць дыплём і працаваў па спэцыяльнасьці ў Дэпартамэнце Аховы Здароўя Заходняй Аўстраліі (з часам нават на кіраўнічых пасадах). Актыўна ўдзельнічаў у грамадзкім жыцьці беларусаў Пэрту. Радны БНР. Сябра Беларускага Аб’еднаньня ў Заходняй Аўстраліі. Дапамагаў у набыцьці Беларускага Народнага Дому. Браў удзел у нацыянальных сьвятах. Актыўна падтрымліваў беларускую эміграцыйную прэсу.

**Булаўскі Антон** (25.11.1910 — 1994(?)). Паходзіў з-пад Бабруйску. Афіцэр Чырвонай Арміі. У часе Другой Сусьветнай вайны камандаваў ротай самаахові, афіцэр Беларускай Краёвай Абароны. Ад лета 1944 году — у Нямеччыне. У 1948 годзе выехаў у Аўстралію. Жыў у Сыднэі. У 50-х гадах актыўна ўдзельнічаў у беларускім грамадзкім жыцьці. Сябра Беларускага Аб’еднаньня ў Аўстраліі (прыхільнікаў БЦР). У 1955—1957 гадах — начальнік Краёвага Штабу Беларускага Вызвольнага Фронту ў Аўстраліі. Пазьней быў сябрам Беларускага Культурна-Грамадзкага Клюбу.

**Бурнос Вольга** (дзяв. Пашкевіч; 19.10.1933 — 8.11.2003). Нарадзілася ў в. Вядом (Івацэвіцкі раён Брэсцкай вобласьці) у сялянскай сям’і. Падчас Другой Сусьветнай вайны апынулася разам зь сям’ёй у Нямеччыне, адкуль у 1950 годзе выехала ў Аўстралію. У Мэльбурне працавала па кантракце ў шпіталі, потым перабралася да бацькі ў Ваялу (Паўднёвая Аўстралія). Тут у 1952 годзе пазнаёмілася зь Міхасём Бурносам, зь якім і пабралася шлюбам. Нарадзіла дзьвюх дачок. У 1955 годзе сям’я пераехала ў Адэляйду, дзе адразу далучылася да жыцьця беларускай грамады. Удзельнічала ў зьбіраньні грошай на пабудову беларускай царквы. Сьпявала ў царкоўным хоры. Была надзвычай актыўнай у беларускім жыцьці Адэляйды. Шмат вышывала нацыянальнае адзеньне, ручнікі й г.д. Пісала музыку для мясцовага хору, якая была высока ацэненая спэцыялістамі. Была актыўнай удзельніцай мерапрыемстваў і беларускай парафіі, і Беларускага Аб’еднаньня ў Паўднёвай Аўстраліі. Пахаваная на праваслаўнай частцы могілак *Centennial Park* у Адэляйдзе.



**Бурнос Міхась, айцец** (нар. 12.10.1924). Нарадзіўся ў в. Лясок Наваградзкага павету ў сялянскай сям’і. Вучыўся ў Наваградзкай настаўніцкай сэмінарыі, а пазьней у гімназіі імя Максіма Багдановіча ў Ватэнштэце. Ад 1949 году — у Аўстраліі. Адзін зь першых беларусаў Адэляйды, што ўдзельнічалі ў стварэньні парафіі Сьвятых Апосталаў Пятра й Паўла. Доўгачасовы рэгент царкоўнага хору. Арганізатар і кіраўнік танцавальнай групы «Лявоніха» (1979—1987). 4 студзеня 1987 году быў высьвячаны ў ярэі й стаў настаяцелем парафіі БАПЦ у Адэляйдзе. Сябра Выканаўчага Камітэту Фэдэральнай Рады Беларускіх Арганізацыяў у Аўстраліі. Стварыў аўстралійска-беларускі сэктар Чарнобыльскага фонду ў Адэляйдзе. Актыўна ўдзельнічаў у працы Беларускага Аб’еднаньня ў Паўднёвай Аўстраліі. У 1999 годзе адышоў ад актыўнай сьвятарскай дзейнасьці ў парафіі й стаў старшынём Беларускага Гістарычнага Згуртаваньня Аўстраліі.

**Васіленя Аляксей** (27.03.1899 — 26.07.1978). Нарадзіўся ў в. Малая Бераставіца (сёньня Бераставіцкі раён Гарадзенскай вобласьці) у сям’і чыноўніка. Вучыўся ў Гарадзенскім рэальным вучылішчы. Падчас Першай Сусьветнай вайны — у эвакуацыі. Скончыў рэжысэрскія курсы ў Новарасійску. Пасьля кастрычніцкага перавароту ваяваў у кавалерыйскім корпусе генэрала Дзянікіна. У 1921 годзе вярнуўся на Радзіму, працаваў у беларускім аб’езным тэатры да моманту яго ліквідацыі польскімі ўладамі. У 1927—1928 гадах — сакратар Палескага аддзелу Беларускай Сялянска-Работніцкай Грамады. Пазьней выконваў абавязкі сакратара беларускага пасольскага клюбу «Змаганьне». У часе нямецкай акупацыі — кіраўнік Беларускай Народнай Самапомачы ў Слоніме, кіраўнік канцылярыі Галоўнага Камандаваньня Беларускай Краёвай Абароны, удзельнік Другога Ўсебеларускага Кангрэсу. Летам 1944 году выехаў у Нямеччыну, жыў у Бэрліне, займаў пасаду сакратара Прэзыдыюму Беларускай Цэнтральнай Рады. Ад 1949 году — у Аўстраліі. Актыўны ўдзельнік жыцьця беларускае грамады ў Сыднэі. Адзін з арганізатараў Беларускага Аб’еднаньня ў Новай Паўднёвай Валіі, у якім займаў розныя пасады. Радны БНР. Шматгадовы распаўсюднік беларускага друку й сталы прадстаўнік газэты «Беларус» у Сыднэі. Пахаваны на беларуска-ўкраінскай частцы могілак Роквуд у Сыднэі.

**Гавенчык Янка** (11.11.1921 — ?). Нарадзіўся на Беласточчыне, дзе падчас нямецкай акупацыі працаваў у Самапомачы. Ад 1950 году — у Аўстраліі. Жыў у Брысбэне (Квінслэнд), дзе спрабаваў наладзіць беларускае грамадзкае жыцьцё. Быў сябрам Задзіночаньня Беларускіх Вэтэранаў у Аўстраліі. Блізу 1954 году перабраўся ў Сыднэй, увайшоў у склад Беларускага Аб'еднаньня ў Новай Паўднёвай Валіі. Ад часу заснаваньня Беларускага Культурна-Грамадзкага Клюбу — адзін зь яго дырэктараў.

**Гайдзель Пётра** (14.07.1912 — люты 1988). Нарадзіўся на Браслаўшчыне ў сялянскай сям'і. Скончыў гімназію марыянаў у Друі. Вучыўся на мэдычным факультэце Віленскага ўнівэрсытэту, дыплём лекара атрымаў у Марбурскім унівэрсытэце (Нямеччына) пасьля заканчэньня Другой Сусьветнай вайны. У 1949 годзе эміграваў у Аўстралію. У Сыднэі вымушаны быў здаваць іспыт на атрыманьне права лекарскай практыкі. Удзельнічаў у арганізацыі беларускага грамадзкага жыцьця ў Новай Паўднёвай Валіі. У сакавіку 1950 году ў Сыднэі браў удзел у першым сходзе сяброў Беларускага Аб'еднаньня ў Новай Паўднёвай Валіі. Сябра аўстралійскага Сэктару Рады БНР. У 1957 годзе разам зь сям'ёй пераехаў у ЗША, дзе таксама займаўся лекарскай працай. Апошнія гады жыў у штаце Вісконсін.

**Груша Аўген** (нар. 6.07.1935). Нарадзіўся ў в. Морач (Клецкі раён Менскай вобласьці) у сялянскай сям'і. У часе Другой Сусьветнай вайны разам з бацькамі апынуўся ў Нямеччыне. Жыў у беларускім лягеры Мітэнвальд, дзе вучыўся ў беларускай школе й браў удзел у скаўтынгу. У 1949 годзе разам зь сям'ёй пераехаў у Аўстралію. Першыя гады жыў з маці ў Новай Паўднёвай Валіі, а ў 1952 годзе перабраўся ў Мэльбурн. Адразу далучыўся да беларускага грамадзкага жыцьця. Скаўт зьвязу «Усяслаў Чарадзей» у Мэльбурне, гуляў у беларускай футбольнай, а пасьля валейбольнай дружыне «Зубр». Сябра Беларускага Аб'еднаньня ў Вікторыі, а пазьней — Беларускага Цэнтральнага Камітэту ў Вікторыі й ягоны прадстаўнік у Радзе Паняволеных Народаў. Актыўны ўдзельнік нацыянальных мерапрыемстваў. Адзін з заснавальнікаў другой беларускай школы на пачатку 70-х гадоў, для якой прапанаваў уласнае памяшканьне. Адзін з ініцыятараў Сустрэчаў Беларусаў Аўстраліі. Ад 1985 году — нязьменны старшыня Выканаўчага Камітэту Фэдэральнай Рады Беларускіх Арганізацыяў у Аўстраліі й адзін з найбольш дзейных сяброў беларускай грамады ў Мэльбурне.

**Груша Надзея** (дзяв. Сасноўская; 22.10.1937 — 25.10.1999). Нарадзілася ў г. Горкі (Магілёўскай вобласьці) у сям'і рэпрэсаванага. У 1943 годзе зь сям'ёй апынулася ў Нямеччыне. Ад 1950 году — у Аўстраліі. Скончыла Стоц Бізнэс Коледж у Мэльбурне з дыплёмам сакратаркі-машыністкі, працавала на пасадзе мэнэджэра вялікай крамы, а пазьней — у кампаніі «Джэнэрал Мотарс Голдэн». У Мэльбурне пазнаёмілася й у 1957 годзе пабралася шлюбам з Аўгенам Грушам. Нарадзіла трох дзяцей: двух сыноў і дачку. Актыўна ўдзельнічала ў жыцьці беларускай грамады Мэльбурну. Была сяброўкай Беларускага Цэнтральнага Камітэту ў Вікторыі, доўгагадовай сакратаркай Беларускага Жаночага Камітэту. Пры канцы 70-х гадоў была сяброўкай Жаночай Сэкцыі Рады Паняволеных Народаў. Сакратар Сястрыцтва парафіі Трох Віленскіх Пакутнікаў. Ад 1983 году выконвала абавязкі сакратара, сакратара-скарбніка Фэдэральнай Рады Беларускіх Арганізацыяў у Аўстраліі, удзельнічала ў выданьні Інфармацыйнага Бюлетэня ФРБАА. Сяброўка Беларускага Сацыяльнага Клюбу ў Вікторыі. Дапамагала ў арганізацыі разнастайных нацыянальных мерапрыемстваў беларусаў Мэльбурну, удзельніца беларускага мяшанага хору. Пахаваная на беларускай дзялянцы могільніку Фоўкнэр у Мэльбурне.



**Грыцук Аляксандар, айцец** (нар. 6.09.1928). Нарадзіўся ў в. Дуброва (Рэчыцкі раён Гомельскай вобласьці) у сялянскай сям'і. Падчас нямецкай акупацыі пасьля забойства бацькі й спаленьня вёскі апынуўся ў лягеры Дахаў (Нямеччына), адкуль трапіў у Аўстрыю. Па капітуляцыі быў у лягеры Куфштайн (Аўстрыя), дзе ўдзельнічаў разам з братам — Паўлам Гузам — у заснаваньні беларускага скаўтынгу. У 1949 годзе з маці й братавай сям'ёй прыехаў у Аўстралію. Пасяліўся ў Мэльбурне, дзе быў адным з заснавальнікаў беларускага скаўцкага зьвязу «Усяслаў Чарадзей». Сябра Беларускага Аб'еднаньня ў Вікторыі. Дапамагаў у выданьні часопіса «Новае Жыцьцё» ў Мэльбурне. Удзельнічаў у фірме, што будавала дамы для беларусаў. Пазьней быў высьвячаны на сьвятарства япіскапам УАПЦ Данатам і на працягу 25 гадоў выконваў душпастырскія абавязкі. Адначасова належаў да Беларускага Цэнтральнага Камітэту ў Вікторыі й Камітэту Набыцьця Беларускага Дому (пазьней Каапэратыву), плаціў складкі ў Беларускі Нацыянальны Фонд. Сябра Беларускага Вызвольнага Фронту й Беларускага Сацыяльнага Клюбу.

**Грыцук Тамара** (нар. 1937). Нарадзілася ў сям'і высланага на Ўрал беларуса. У 1940 годзе пераехала з бацькамі ў Глуск. У часе нямецкай акупацыі выехала зь сям'ёй у Нямеччыну, дзе вучылася ва ўкраінскай і нямецкай школах. Ад 1949 году — у Аўстраліі. У Мэльбурне пазнаёмілася й у 1954 годзе пабралася шлюбам з Аляксандрам Грыцуком. Нарадзіла дачку й сына. Далучылася да беларускай грамады Мэльбурну. Удзельнічала ў нацыянальных мерапрыемствах. Некаторы час была старшынёй Беларускага Жаночага Камітэту ў Вікторыі. Сяброўка Беларускага Сацыяльнага Клюбу.

**Гуз Павал** (15.08.1924 — 17.08.2003). Нарадзіўся ў в. Дуброва (Рэчыцкі раён Гомельскай вобласьці) у сялянскай сям'і. Брат Аляксандра Грыцука па маці, разам зь якім прайшоў цераз Дахаў і па капітуляцыі Нямеччыны апынуўся ў лягеры Куфштайн (Аўстрыя), займаўся арганізацыяй беларускага скаўцкага зьвязу імя Івана Луцкевіча. У 1949 годзе разам з жонкай выехаў у Аўстралію. У часе паездкі пазнаёміўся зь Міхасём Зуем і стаў сябрам Беларускай Незалежніцкай Партыі. У Мэльбурне адразу пачаў наладжваць беларускую грамадзкую дзейнасьць. Сакратар першага, створанага ў Мэльбурне, Беларускага Клюбу, які наладзіў ужо ў 1950 годзе сьвяткаваньне ўгодкаў незалежнасьці БНР. Пазьней — сябра ўправы й культурна-асьветны рэфэрэнт Беларускага Аб'еднаньня ў Вікторыі. Дапамагаў у выданьні часопіса «Новае Жыць-

цё» ў Мэльбурне, займаўся тэхнічнай працай. Доўгагадовы сакратар-скарбнік, а ў апошнія гады жыцця й старшыня Беларускага Цэнтральнага Камітэту ў Вікторыі. Ад 1989 году — сакратар Фэдэральнай Рады Беларускіх Арганізацыяў у Аўстраліі. Дэлегат на XIV—XIX Пленумах БЦР, спрыяў абраньню Міхася Зуя на пасаду прэзыдэнта БЦР. Меў узнагароды ад БЦР. Падтрымліваў сувязі зь беларускімі эміграцыйнымі выданьнямі ў іншых краінах, друкаваў нататкі з жыцця беларусаў у Мэльбурне й уласныя вершы пад псэўданімам Паўлюк Дуброўскі.

**Гуз Тэафіля** (дзяв. Пшыбэк; нар. 1924). Нарадзілася ў в. Вяльможа (Польшча). Скончыла пачатковую школу. У 1943 годзе вывезеная на працы ў Нямеччыну. У паваенным лягеры пазнаёмілася з Паўлам Гузам, зь якім у 1947 годзе пабралася шлюбам. Ад 1949 году — у Аўстраліі. Пасяліліся ў Мэльбурне. Нарадзіла двух сыноў. Ад самога прыезду ў Аўстралію ўдзельнічала ў жыцці беларускай грамады. Сяброўка Беларускага Жаночага Камітэту. Актыўнаму ўдзелу ў нацыянальных мерапрыемствах у апошнія гады перашкодзіла хвароба.

**Дзядзюля Лявон** (нар. 1930(?)). У Аўстраліі ў 60-х гадах далучыўся да беларускай грамадзкай дзейнасьці, стаў сябрам Беларуска-Аўстралійскага Незалежнага Аб'яднаньня, якім доўгі час кіраваў. У 1976—1977 гадах — старшыня Беларускага Культурна-Грамадзкага Клюбу.

**Елкановіч Вячаслаў** (нар. 19.01.1957). Нарадзіўся ў Менску. Скончыў Менскі інстытут замежных моваў, перакладнік. У пачатку 90-х гадоў выехаў у Аўстралію. У Сыднэі далучыўся да Беларускага Культурна-Грамадзкага Клюбу. У лютым 1993 году пераняў кіраўніцтва беларускай сэкцыяй радыё ў Сыднэі й да яе закрыцьця (28.06.2003) займаўся падрыхтоўкай і выпускам беларускіх радыёперадачаў.

**Жураўлевіч Адам.** Дакладны час і месца нараджэньня няведамыя. Верагодна, меў настаўніцкую асьвету. Адзін з арганізатараў беларускага грамадзкага жыцця ў Мэльбурне на пачатку 50-х гадоў. Сябра ўправы Беларускага Аб'яднаньня ў Вікторыі. Рэдактар часопіса «Новае Жыцьцё» ў часе ягонага друкаваньня ў Мэльбурне. Адзін з стваральнікаў і настаўнік першай беларускай школы ў раёне Сэнт-Албанс. Пасьля нечаканай сьмерці жонкі адышоў ад актыўнага ўдзелу ў беларускім грамадзкім жыцьці.

**Зуй Міхась** (23.10.1909 — 24.04.1995). Нарадзіўся ў в. Вялікае Сяло (цяпер Шаркаўшчынскі раён Віцебскай вобласьці). У 1932 годзе арганізаваў у вёсцы асьветны гурток «Кола Беларускай Моладзі». Ад 1942 году працаваў у Беларускай Народнай Самапомачы, павятовы кіраўнік Шаркаўшчынскага павету. Сябра Беларускай Незалежніцкай Партыі. Дэлегат Другога Ўсебеларускага Кангрэсу. Ад лета 1944 году — на эміграцыі. Быў у складзе беларускага батальёну Дальвіца. Пазьней перабраўся ў лягер Ватэнштэт. Ад жніўня 1949 году — у Аўстраліі. Удзельнік першага сходу сяброў надпартыйнага Беларускага Аб'яднаньня ў Новай Паўднёвай Валіі ў сакавіку 1950 году, пазьней — стваральнік і нязьменны старшыня Беларускага Аб'яднаньня ў Аўстраліі (БЦРаўскага кірунку). Ад імя гэтай арганізацыі рэпрэзэнтаваў беларусаў на



мерапрыемствах аўстралійскіх грамадзкіх і ўрадавых арганізацыяў. У 50—60-х гадах — арганізатар і кіраўнік беларускага драматычнага гуртку ў Сыднэі. Кіраўнік Дэлегатуры БЦР у Аўстраліі. У 1978 годзе — старшыня Беларускага Культурна-Грамадзкага Клюбу ў Сыднэі. У 1977—1978 гадах — старшыня Выканаўчага Камітэту ФРБАА. На XIX Пленуме БЦР абраны прэзыдэнтам БЦР. Пахаваны на беларуска-ўкраінскай сэкцыі могілак Роквуд у Сыднэі.

**Кавалеўскі Віктар** (нар. 11.01.1956). Нарадзіўся ў Радашкавічах (Маладэчанскі раён Менскай вобласьці). У 1976 годзе скончыў Краснаярскую ваенную вучэльню, служыў у Казахстане й Кыргызстане. Пасьля таго як у 1981 годзе пакінуў шэрагі камуністычнай партыі, звольніўся з узброеных сілаў. Працаваў інжынэрам, тэхнікам, фатографам. У 1992 годзе разам зь сям'ёй эміграваў у Аўстралію. Аўтар кнігі «Беларуская эміграцыя ў Паўднёвай Аўстраліі» й шэрагу іншых выданьняў па гісторыі беларусаў на пятым кантынэнце. Ад 1999 году — старшыня Беларускага Аб'яднаньня ў Паўднёвай Аўстраліі. Сакратар Беларускага Гістарычнага Згуртаваньня Аўстраліі.

**Кажура Дзьмітры** (6.04.1908 — 13.11.1990). Прыехаў у Аўстралію ў 1949 годзе. У 1954 годзе — заступнік старшыні й скарбнік Згуртаваньня Беларускіх Камбатантаў у Вікторыі. Ад самага стварэньня беларускай парафіі Трох Віленскіх Пакутнікаў у Мэльбурне браў актыўны ўдзел у рэлігійным жыцьці, доўгі час быў старастам царквы. Ахвяраваў грошы на выданьне кнігі «Кацыхізіс, або навука веры» (1960) для беларускіх вернікаў.

**Калесьнiковіч Вера** (дзяв. Арцямюк; нар. 6.09.1935). Нарадзілася ў в. Парцава Бельск-Падляскага павету (сёньня Падляскае ваяводзтва, Польшча) у сялянскай сям'і. Скончыла сямігодку й вучылася на курсах, пасьля якіх працавала ў Беластоку на баваўнянай фабрыцы. У пачатку 60-х гадоў на запрашэньне сваякоў прыехала ў Сыднэй, адкуль перабралася ў Адэляйду. Тут пазнаёмілася з Уладзімерам Калесьніковічам, зь якім у 1966 годзе пабралася шлюбам. Некаторы час працавала на фабрыцы. Нарадзіла двух дзяцей. Брала актыўны ўдзел у жыцьці беларускай грамады ў Адэляйдзе — сьпявала ў хоры, дапамагала ў арганізацыі нацыянальных мерапрыемстваў беларускай парафіі Сьвятых Апосталаў Пятра й Паўла ды Беларускага Аб'яднаньня ў Паўднёвай Аўстраліі.

**Калесьніковіч Уладзімер** (нар. 28.11.1926). Нарадзіўся ў в. Ліпнікі (сёньня Пінскі раён Брэсцкай вобласьці) у сям'і лесьніка, які працаваў у валоданьнях графа Радзівіла (пазьней — у графа Патоцкага). Вучыўся ў польскай і савецкай школах. У 1942 годзе разам зь сям'ёй перабраўся ў Лагішын, а ў 1944 годзе выехаў у Нямеччыну. Знаходзіўся ў лягеры Голстынг у Кёнігсбэргу, пазьней — у маёнтку баўэра блізу гораду Швэд. У 1946—1947 гадах — у польскім лягеры, а пазьней — у беларускім лягеры Ватэнштэт, зь якога ў 1950 годзе пераехаў у Аўстралію. Да 1956 году жыў у Тайлем-Бэндзе, адкуль перабраўся ў Адэляйду й далучыўся да жыцьця парафіі Сьвятых Апосталаў Пятра й

Паўла. Браў актыўны ўдзел у пабудове царквы. Сьпяваў у царкоўным хоры, а ў 1987—1999 гадах — быў ягоным рэгентам. У 1986—1999 гадах выконваў абавязкі скарбніка ў парафіяльнай радзе, а таксама ў 1981—1987 і 1989—1993 гадах быў скарбнікам у Беларускім Аб'еднаньні ў Паўднёвай Аўстраліі.

**Калодка Аляксандар** (14.12.1911 — 15.11.1985). Нарадзіўся ў в. Церабостынь Стаўпецкага павету (цяпер Карэліцкі раён Гарадзенскай вобласьці) у сялянскай сям'і. Скончыў гарадзкую вучэльню ў Ярэмічах (сёньня Карэліцкі раён), у 1926 годзе паступіў у Віленскую беларускую гімназію. У 1928—1932 гадах вучыўся ў польскай гімназіі імя Адама Міцкевіча ў Вільні. Супрацоўнічаў з газэтамі «Беларускі дзень» і «Сялянская ніва». У 1938 годзе скончыў юрыдычны факультэт Віленскага ўнівэрсытэту з дыплёмам магістра права. Працаваў у юрыдычным аддзеле грамадзкага забесьпячэньня. У 1940—1941 гадах настаўнічаў у Вільні. Ад верасьня 1941 году працаваў надзвычайным упаўнаважаным акругована камісара ў Вялейцы, дзе займаўся беларусізацыяй адміністрацыі. У 1943 годзе арыштаваны вялейскім гестапа. Быў вязьнем канцэнтрацыйных лягераў у Асьвенціме, Біркенаў, Бухенвальдзе й інш. Па сканчэньні вайны працаваў у Беларускім Нацыянальным Камітэце, супрацоўнічаў зь беларускай прэсай, Арганізацыяй Былых Вязьняў Нямецкіх Канцэнтрацыйных Лягераў. Сябра Рады БНР ад яе аднаўленьня ў 1947 годзе. У траўні 1948 году прыехаў у Аўстралію, працаваў на цукровых плянтацыях у Квінслэндзе, а пазьней — рабочым у Мэльбурнскім порце. Арганізатар беларускага Сэктару Рады БНР у Аўстраліі, першага Беларускага Клюбу ў Мэльбурне. У 1950 годзе стаў адным з заснавальнікаў апалітычнага Беларускага Аб'еднаньня ў Аўстраліі, якое, аднак, праз год пакінуў. Сябра Згуртаваньня Беларусаў у Вікторыі, Згуртаваньня Беларускіх Камбатантаў, Каардынацыйнага Камітэту Беларускіх Арганізацыяў у Аўстраліі, Беларускага Цэнтральнага Камітэту ў Вікторыі. Сталы аўтар зацемак пра жыцьцё беларусаў Мэльбурну ў газэтах «Бацькаўшчына» й «Беларус». Сябра Беларускага Інстытуту Навукі й Мастацтва. Пахаваны на беларускім могільніку Фоўкнэр у Мэльбурне.

**Камінскі Барыс, айцец** (? — 22.06.1969). У часе Другой Сусьветнай вайны апынуўся ў Нямеччыне, дзе пры канцы 40-х гадоў атрымаў сьвятарскі сан, пасьля чаго выехаў у Аўстралію. Першыя гады жыў у Квінслэндзе, а ў сярэдзіне 50-х перабраўся ў Заходнюю Аўстралію. У 1956 годзе з блаславеньня архіяпіскапа Сяргея арганізаваў парафію Жыровіцкае Божае Маці БАПЦ у Пэрце й быў адным з ініцыятараў пабудовы тут беларускай царквы. Аднак хутка па прыезьдзе архіяпіскапа Сяргея на сталае жыхарства ў Пэрт — выехаў у Мэльбурн, дзе празь некаторы час служыў у грэцкай праваслаўнай царкве. Часам браў удзел у набажэнствах для беларускіх вернікаў. Загінуў у няшчасным выпадку, пахаваны на могільніку Фоўкнэр у Мэльбурне.

**Кандрусік Галіна** (нар. ?). Нарадзілася на Беласточчыне. Ад 50-х гадоў — у Адэляйдзе. Нарадзіла двух дзяцей. Актыўная ўдзельніца



беларускай парафіі Сьвятых Апосталаў Пятра й Паўла, доўгія гады сьпявала ў царкоўным хоры. Сяброўка Беларускага Аб'еднаньня ў Паўднёвай Аўстраліі, а ў 1988—1997 гадах займала пасаду скарбніка гэтае арганізацыі.

**Каранеўская Аўгіньня** (дзяв. Воўк-Левановіч; 6.01.1919 — 30.03.1983). Нарадзілася ў маёнтку Ясны Лес на Бабруйшчыне ў сям'і нашчадкаў баярскага роду. У 1920 годзе разам з бацькамі пераехала ў м. Мядзьведзічы (сёньня Ляхавіцкі раён Брэсцкай вобласьці). У 1937 годзе скончыла Віленскую беларускую гімназію, паступіла на хімічны факультэт Віленскага ўнівэрсытэту. У 1939 годзе вярнулася ў Мядзьведзічы, дзе працавала настаўніцай беларускай мовы ў школе. Падчас нямецкай акупацыі настаўнічала ў Баранавічах. Дэлегатка ад Баранавіцкае акругі на Другі Ўсебеларускі Кангрэс. Ад лета 1944 году — на эміграцыі ў Нямеччыне. У 1946 годзе пабралася шлюбам з інжынэрам Міколам Каранеўскім. Ад 1949 году — у Аўстраліі. Нарадзіла сына й дачку, якія атрымалі вышэйшую асьвету. У 1973 годзе страціла мужа. Ад самага прыезду ў Сыднэй далучылася да беларускай грамады. Доўгі час старшыня Сэктару Рады БНР у Аўстраліі, распаўсюдніца беларускай прэсы, сталая аўтарка газэты «Беларус». Сябра Беларускага Культурна-Грамадзкага Клюбу. Спрабавала стварыць асобную беларускую жаночую арганізацыю ў Сыднэі, але няўдала. Актыўна дапамагала ў арганізацыі нацыянальных мерапрыемстваў, выставаў. Чытала лекцыі па беларускіх вышыванках для сяброўак Аўстралійскае Вышывальнае Гільдыі. Ад 1976 году — супрацоўніца Беларускага Радыёвага Камітэту ў Сыднэі. Пахаваная на беларуска-ўкраінскай сэкцыі могільніку Роквуд у Сыднэі.

**Каранеўскі Мікалай** (25.07.1916 — 23.05.1973). Вучыўся ў Варшаўскай палітэхніцы, Львоўскім політэхнічным інстытуце (1940—1941), аднак дыплём інжынэра атрымаў ужо па заканчэньні Другой Сусьветнай вайны ў Мюнхене. Ад 1949 году — у Аўстраліі. Спачатку жыў у Мэльбурне, дзе ўдзельнічаў у арганізацыі беларускае грамады. Пры канцы 50-х гадоў перабраўся зь сям'ёй у Сыднэй, дзе актыўна ўключыўся ў грамадзкую дзейнасьць. У 1966—1973 гадах — старшыня Беларускага Аб'еднаньня ў Новай Паўднёвай Валіі. Адзін з арганізатараў Беларускага Культурна-Грамадзкага Клюбу ў Сыднэі. Доўгі час займаўся распаўсюдам беларускае літаратуры й фундаваў беларускую выдавецкую справу. Пахаваны на беларуска-ўкраінскай дзялянцы могілак Роквуд у Сыднэі.

**Качан Аркадзь** (13.05.1921 — 4.12.1982). Нарадзіўся ў в. Барсукі (сёньня Докшыцкі раён Віцебскай вобласьці) у сям'і настаўнікаў. Вучыўся ў Дзісенскай польскай гімназіі, у 1941 годзе скончыў дзесяцігодку ў Маладэчне. Пазьней працаваў сакратаром суду ў Глыбокім. Па сканчэньні курсаў каманднага складу Беларускае Самаахoвы ў Лебедзеве, блізу Маладэчна, кіраваў ротай у Вялейскай акрузе. Улетку 1944 году выехаў у Нямеччыну, некалькі гадоў правёў у лягеры ў Розэнгайме. Ад 1950 году — у Аўстраліі. Адзін з заснавальнікаў і доўгагадовы

сакратар Беларускага Аб’яднаньня ў Новай Паўднёвай Валіі. Сябра Рады БНР, Беларускага Культурна-Грамадзкага Клюбу й Фэдэральнай Рады Беларускіх Арганізацыяў у Аўстраліі. Пры канцы 70-х гадоў — беларускі прадстаўнік у Выканаўчым Камітэце Этнічнай Рады ў Новай Паўднёвай Валіі. Адзін з стваральнікаў і каардынатар беларускага радыё ў Сыднэі. Сталы фундатар беларускіх выданьняў і ўстановаў на эміграцыі. Дасылаў беларускую літаратуру ў бібліятэкі аўстралійскіх унівэрсытэтаў. Пахаваны на беларуска-ўкраінскай дзялянцы могілак Роквуд у Сыднэі.

**Качан Вольга** (дзяв. Сьвідэрская; нар. 23.07.1928). Нарадзілася ў Пачаеве на Валыні ва ўкраінскай сям’і. Вучылася ў Варшаве ва ўкраінскай школе імя Лесі Украінкі, затым — у Чэхаславаччыне. Пасьля Другой Сусьветнай вайны працавала перакладніцай ва ўстановах *UNRRA* й *IRO* ў Нямеччыне. У 1950 годзе пераехала ў Аўстралію, дзе пабралася шлюбам з беларусам Аркадзем Качаном, нарадзіла сына. Скончыла гуманістычны факультэт Сыднэйскага ўнівэрсытэту, дзе ад 1966 году выкладала псыхалёгію. Прафэсар, ганаровы сябра ўнівэрсытэту, спэцыялізуецца на псыхалінгвістыцы, мае ўзнагароду як выдатны выкладчык. Удзельніца розных украінскіх, аўстралійскіх і міжнародных навуковых канфэрэнцыяў і арганізацыяў. Першая кіраўніца Аб’яднаньня Праваслаўных Сяструыцтваў Аўстраліі й Новай Зэляндыі. Разам з мужам падтрымлівала шчыльныя сувязі зь беларускай грамадой Сыднэю. У 1980 годзе на канфэрэнцыі ў Канбэры выступала з рэфэратам з гісторыі беларускай літаратуры XIX стагодзьдзя. Аўтарка артыкула пра беларусаў у Аўстраліі ў энцыкляпэдыі. Актыўна ўдзельнічала ў працы Беларускага Культурна-Грамадзкага Клюбу, а таксама ў падрыхтоўцы беларускіх радыёпраграмаў у Сыднэі. Рэгулярна передавала беларускія часопісы ў бібліятэку Сыднэйскага ўнівэрсытэту. Ахвяравала сродкі на падтрымку беларускіх эміграцыйных выданьняў.

**Клуніцкі Уладзімер** (20.05.1912 — 1974). Паводле некаторых зьвестак, паходзіў зь Менску. Меў адукацыю агранома. У 1948 годзе прыехаў у Аўстралію, дзе адразу стаў адным з актыўных арганізатараў беларускага жыцьця. Удзельнічаў у стварэньні першага Беларускага Клюбу й агульнага Беларускага Аб’яднаньня ў Новай Паўднёвай Валіі (пазьней перайменаванага ў Беларускае Аб’яднаньне ў Аўстраліі). У межах дзейнасьці гэтых арганізацыяў наладзіў выданьне часопіса «Новае Жыцьцё» й удзел беларусаў у першых міжнацыянальных выставах новых аўстралійцаў. Пасьля падзелу Беларускага Аб’яднаньня ў Аўстраліі ў 1952 годзе далучыўся да Беларускага Аб’яднаньня ў Новай Паўднёвай Валіі, але хутка выйшаў з гэтае арганізацыі й стварыў групу «незалежнікаў», афіцыйнай структурай якіх праз некаторы час стала Беларуска-Аўстралійскае Незалежнае Аб’яднаньне. Падтрымліваў сувязі зь Сяргеем Хмарам у Канадзе й ягонымі выданьнямі «Беларускі Голас» і «Баявая Ўскалось», на старонках якіх рэгулярна друкаваўся. Быў ідэолягам «надпартыйнасьці» ў Аўстраліі. У 1954 годзе выдаў брашуру «Першыя крокі», прысьвечаную пачаткам беларускага грамадзкага жыцьця ў Аўстраліі й палітычнаму падзелу. У 1955—1956 гадах спрабаваў аднавіць выданьне ўласнага часопіса «Да Перамогі», але выйшлі толькі два нумары.



**Колес** (Калесьніковіч) **Мікола** (нар. 12.05.1932). Малодшы брат Уладзімера Калесьніковіча. У 1946—1947 гадах вучыўся ў польскай школе лягеру Маервік блізу Фленсбургу, пасьля чаго ўся сям’я перабралася ў беларускі лягер Ватэнштэт, дзе скончыў чатыры клясы беларускай гімназіі. У 1950 годзе пераехаў у Аўстралію. У Адэляйдзе далучыўся да грамадзкага жыцьця. Цягам 1987—1999 гадоў — старшыня Беларускага Аб’яднаньня ў Паўднёвай Аўстраліі. У часе ягонага кіраўніцтва была адчыненая беларуская экспазыцыя ў Этнічным музэі ў Адэляйдзе, а таксама пабудаваны сумесна з харватамі й украінцамі хастэль Сьвятой Ганны (дом для састарэлых асобаў).

**Кудрук Янка** (14.04.1914 — 20.05.1984). Капітан Беларускай Краёвай Абароны. У 1949 годзе зь Нямеччыны разам зь сям’ёй пераехаў у Аўстралію. Актыўны ўдзельнік грамадзкага жыцьця беларусаў у Мэльбурне. Адзін з заснавальнікаў і першы кіраўнік Беларускага Аб’яднаньня ў Вікторыі (1950). Удзельнік стварэньня ў Мэльбурне арганізацыі Беларускага Вызвольнага Руху ў 1953 годзе. Аднак пры канцы 50-х гадоў адышоў ад актыўнай грамадзкай дзейнасьці беларусаў з прычыны непрыманьня міжгрупавой барацьбы. Пахаваны на беларускай дзялянцы могільніку Фоўкнэр у Мэльбурне.

**Кулакоўскі Аляксандар, айцец** (нар. 25.03.1925). Нарадзіўся на Наваградчыне. У часе Другой Сусьветнай вайны апынуўся ў Нямеччыне, адкуль у 1949 годзе эміграваў у Аўстралію. Пасяліўся ў Мэльбурне, тут браў удзел у арганізацыі парафіі Трох Віленскіх Пакутнікаў БАПЦ у 1958 годзе, дзе ад пачатку працаваў рэгентам. На пачатку 1963 году ўзьведзены ў дыяканы, а пры канцы таго ж году высьвячаны на сьвятарства й узначаліў беларускую парафію ў Мэльбурне. На гэтай пасадзе застаецца й да сёньня. Ініцыятар набыцьця беларускай дзялянкі на мэльбурнскім могільніку Фоўкнэр, пабудовы на ёй Помніку «На вечны ўспамін спачылых усіх ведамых і няведамых Беларусаў», а таксама ўласнага будынку для царквы. Ад 1964 да 1992 (?) году працягнуў выданьне «Беларускага Праваслаўнага Календара» для вернікаў парафіі.

**Кунцэвіч Анатоль, айцец** (псэўд. Анатоль Сумны, 14.06.(04)1912 — ?). Нарадзіўся на Беласточчыне. Скончыў тэалягічны факультэт у Варшаве й быў высьвячаны ў духоўны сан. Паэт, сябра Літаратурнай Сустані «Баявая Ўскалось». Ад 1949 году жыў у Аўстраліі. Удзельнік Беларускага Аб’яднаньня ў Аўстраліі ў першыя гады яго існаваньня. Дапамагаў у набажэнствах для беларусаў Сыднэю ў 50-х гадах. Пазьней адышоў ад грамадзкай і сьвятарскай дзейнасьці.

**Лужынская Надзея** (5.12.1924 — 27.02.2000). Нарадзілася ў в. Брусы (сёньня Мядзельскі раён Менскай вобласьці) у сям’і рыбакоў. Атрымала пачатковую асьвету й вучылася на краўчыху. У 1944 годзе паехала ў Нямеччыну шукаць вывезеных немцамі бацькоў. У беларускім лягеры Ватэнштэт пазнаёмілася й пабралася шлюбам зь Міхасём Лу-

жынскім. У 1950 годзе выехала ў Аўстралію. Жыла ў Сыднэі, нарадзіла трох дзяцей: сына й двух дачок. Разам з мужам актыўная ўдзельніца беларускай грамады Сыднэю. Ад заснаваньня — сяброўка Беларускага Аб'еднаньня ў Новай Паўднёвай Валіі, а пазьней і Беларускага Культурна-Грамадзкага Клюбу. Некаторы час была старшынёй Жаночага Камітэту. Актыўная ўдзельніца беларускіх нацыянальных мерапрыемстваў, выставаў. Дапамагала ў падрыхтоўцы беларускіх радыёпраграмаў. Пахаваная на беларуска-ўкраінскай сэкцыі могільніку Роквуд у Сыднэі.

**Лужынскі Міхась** (нар. 16.07.1926). Нарадзіўся ў в. Кабылкі (цяпер в. Зоранька, Маладэчанскі раён Менскай вобласьці) у сялянскай сям'і. Вучыўся ў польскай школе ў Гарадку, а ў 1942 годзе паступіў у гандлёвую школу ў Маладэчне. Сябра СБМ. У 1944 годзе выехаў у Нямеччыну, дзе пасьля вайны апынуўся ў беларускім лягеры Ватэнштэт. Ад 1950 году разам з жонкай выехаў у Аўстралію. Пасяліўся ў Сыднэі, дзе далучыўся да беларускага грамадзкага жыцьця. Радны БНР. У 1952 годзе — першы старшыня асобнай арганізацыі прыхільнікаў Рады БНР Беларускага Аб'еднаньня ў Новай Паўднёвай Валіі. У 1953—1954 гадах — рэдактар БНРаўскага варыянту часопіса «Новае Жыцьцё». Пазьней — сакратар Беларускага Культурна-Грамадзкага Клюбу, а ў 1982—1986 і ад 1988 году да сёньня яго старшыня. Ад 1976 году — сябра Беларускага Радыёвага Камітэту, а ад 1983 году цягам дзесяцігодзьдзя быў, фактычна, адзіным стваральнікам беларускіх радыёпраграмаў у Сыднэі. У 1976—1980 гадах — сакратар Фэдэральнай Рады Беларускіх Арганізацыяў у Аўстраліі.

**Макарэвіч Янка** (26.07.1909 — 18.10.1995). Паводле некаторых зьвестак, нарадзіўся на Берасьцейшчыне. Служыў у польскім войску. У часе вайны апынуўся ў Нямеччыне. Паэт, друкаваўся на старонках часопіса «Баявая Ўскалось». У 1949 годзе прыехаў у Аўстралію. Далучыўся да грамадзкага жыцьця беларусаў Сыднэю. Браў удзел у дзейнасьці Беларускага Аб'еднаньня ў Аўстраліі. Адзін з ідэолягаў «незалежнікаў», уваходзіў у кіраўніцтва Беларуска-Аўстралійскага Незалежнага Аб'еднаньня ў Новай Паўднёвай Валіі, нейкі час рэпрэзэнтаваў яго ў ФРБАА. Пахаваны на беларуска-ўкраінскай сэкцыі могільніку Роквуд у Сыднэі.

**Малецкі Язэп** (12.01.1906 — 6.06.1982). Нарадзіўся ў в. Якузы (сёньня Мёрскі раён Віцебскай вобласьці) у сялянскай сям'і. Скончыў гімназію ў Друі, а пазьней — мэдычны факультэт Віленскага ўнівэрсытэту. Падчас нямецкае акупацыі працаваў у беларускай адміністрацыі — Віленскім беларускім камітэце, быў дырэктарам Мэдычнае школы ў Баранавічах, намесьнікам прэзыдэнта БЦР на Вялейскую акругу. Ад 1949 году — у Аўстраліі. Здолеўшы пацьвердзіць пасьля дадатковага навучаньня дыплём мэдыка, атрымаў права лекарскай практыкі, якой займаўся ў Сыднэі цягам доўгіх гадоў. Далучыўся да беларускага грамадзкага жыцьця. Актыўны сябра ўправы Беларускага Аб'еднаньня ў Новай Паўднёвай Валіі, а ў 1960—1961 гадах — ягоны старшыня. Адзін з дырэктараў Беларускага Культурна-Грамадзкага Клюбу ў Сыднэі. Старшыня аўстралійскага Сэктару Рады БНР. Адзін з ініцыятараў стварэньня й старшыня Фэдэральнай Рады Беларускіх Арганізацыяў у Аўстраліі ў 1979—1980 гадах. Сталы карэспандэнт розных беларускіх эміграцыйных пэрыёдыкаў (пісаў таксама пад псэўданімам Я. Лаўрыновіч). Аўтар біяграфічнай кнігі «Пад знакам Пагоні» (Таронта, 1976). Пахаваны на беларуска-ўкраінскай сэкцыі могільніку Роквуд у Сыднэі.



**Мароз Алекс (малодшы).** Нарадзіўся ў Аўстраліі. Настаўнік з адукацыі. Радны БНР. Актыўны сябра Беларускага Аб'еднаньня ў Заходняй Аўстраліі, дзе ад канца 80-х гадоў займаў пасады сакратара й скарбніка.

**Мароз Аляксандар (старэйшы)** (16.08.1918 — 8.11.1989). Нарадзіўся ў в. Кацяўшчына на Валожыншчыне. У 1949 годзе прыехаў у Аўстралію. Ад 1954 году — сябра аддзелу Задзіночаньня Беларускіх Вэтэранаў у Пэрце, займаў розныя пасады (у тым ліку й старшыні) у Беларускім Аб'еднаньні ў Заходняй Аўстраліі. Адзін з ініцыятараў і галоўны будаўнік Беларускага Народнага Дому ў Пэрце. Ад 1984 году — сябра Рады БНР. Доўгачасовы прадстаўнік беларускай прэсы ў Заходняй Аўстраліі.

**Марчанка Васіль** (нар. 29.08.1932). Паводле некаторых зьвестак, паходзіў з ваколіцаў Рэчыцы (Гомельская вобласьць). У Аўстралію прыехаў у 1948 годзе. У Сыднэі далучыўся да прыхільнікаў БЦР, сябра Беларускага Аб'еднаньня ў Аўстраліі. Ад часу арганізацыі Беларускага Культурна-Грамадзкага Клюбу ўваходзіў у лік сяброў і доўгія гады быў ягоным гаспадаром.

**Мікуліч Пётра** (12.08.1922 — 23.08.1981). Нарадзіўся ў в. Бараўцы (цяпер Вялейскі раён Менскай вобласьці) у сялянскай сям'і. Пасьля сканчэньня шасьцігадовай пачатковай школы вучыўся на вячаровых курсах для дарослых, дзе асабліва зацікавіўся музыкай і сьпевамі. Пры канцы Другой Сусьветнай вайны апынуўся ў Інгальштаце (Нямеччына), адкуль у 1948 годзе эміграваў у Аўстралію. Адзін з ініцыятараў заснаваньня Згуртаваньня Беларусаў у Вікторыі, сакратар падсэктару Рады БНР у Мэльбурне, скарбнік Каапэратыву Беларускага Дому, скарбнік Беларускага Цэнтральнага Камітэту ў Вікторыі. Доўгі час быў рэгентам царкоўнага хору парафіі Трох Віленскіх Пакутнікаў у Мэльбурне. Арганізаваў і да апошніх дзён жыцьця кіраваў беларускім мяшаным хорам. Пахаваны на беларускай дзялянцы могільніку Фоўкнэр у Мэльбурне.

**Нарушэвіч Вольга** (дзяв. Воўк-Левановіч; нар. 1924 г.). Нарадзілася ў м. Мядзьведзічы Баранавіцкае акругі (сёньня Ляхавіцкі раён Брэсцкай вобласьці). Сястра Аўгіньні Каранеўскай. Вучылася ў Віленскай беларускай гімназіі, Баранавіцкай мэдычнай школе, на эміграцыі студыявала фармацэўтыку ў Лювэнскім унівэрсытэце (Бэльгія). У 1952 годзе сьледам за бацькамі пераехала ў Аўстралію. У Сыднэі пабралася шлюбам з інжынэрам Станіславам Нарушэвічам. Нарадзіла сына. Ра-

зам з мужам далучылася да беларускай грамады Сыднэю. Сяброўка Беларускага Культурна-Грамадзкага Клюбу. Дапамагала ў падрыхтоўцы нацыянальных выставаў. Доўгачасовы ахвярадаўца на беларускія эміграцыйныя выданьні й розныя грамадзкія ініцыятывы.

**Нарушэвіч Станіслаў** (23.05.1913 — 2001). Паходзіў з Браслаўшчыны. У 1944 годзе працаваў у Бэрліне ў беларускай сэкцыі радыё «Вінэта». Пасьля Другой Сусьветнай вайны скончыў Горны ўнівэрсытэт у Боне (Нямеччына) з дыплёмам інжынэра. Прыехаў у Аўстралію ў лістападзе 1947 году, працаваў на Сьнежнагорскай гідраэлектрычнай сыстэме. Радны БНР. Адзін з стваральнікаў Беларускага Аб'еднаньня ў Новай Паўднёвай Валіі, ягоны апошні старшыня ў 1972—1980 гадах. Быў таксама некаторы час старшынём аўстралійскага Сэктару Рады БНР. Сябра Беларускага Культурна-Грамадзкага Клюбу. Пахаваны на беларуска-ўкраінскай сэкцыі могільніку Роквуд у Сыднэі.

**Нікан Мікола** (3.01.1908 — 16.06.1999). Нарадзіўся ў Варшаве. У 1929 годзе служыў у польскім войску, пасьля — настаўнічаў у Беларусі, выкладаў на настаўніцкіх курсах у Горадні. У 1939 годзе быў арыштаваны савецкімі ўладамі й высланы ў Варкуту. Ад 1942 году — у войску генэрала Андэрса. У шэрагах 2-га польскага корпусу прайшоў праз Сырыю, Эгіпет, удзельнічаў у вайсковых апэрацыях у Італіі. У 1947 годзе дэмабілізаваўся ў ранзе капітана. Браў актыўны ўдзел у арганізацыі Згуртаваньня Беларусаў у Вялікай Брытаніі. У 1952 годзе пераехаў на сталае жыхарства ў Мэльбурн, дзе адразу далучыўся да беларускага грамадзкага жыцьця. Выконваў розныя абавязкі ў беларускіх арганізацыях Мэльбурну: быў сакратаром Згуртаваньня Беларусаў у Вікторыі, сакратаром Беларускага Цэнтральнага Камітэту ў Вікторыі. Доўгі час быў прадстаўніком БЦКВ у Радзе Паняволеных Народаў. Выкладаў беларускую мову й геаграфію ў беларускай школе ў Мэльбурне. Адзін з ініцыятараў набыцьця Беларускага Дому, падтрымаў ідэю арганізацыі Сустрэчаў Беларусаў Аўстраліі. Доўгія гады распаўсюджваў беларускую прэсу ў штаце Вікторыя й быў сталым карэспандэнтам з Мэльбурну розных эміграцыйных выданьняў. Пахаваны на беларускай дзялянцы могільніку Фоўкнэр у Мэльбурне.

**Раецкая Вера** (па айчыму Кавалевіч; 7.07.1932 — 19.07.1995). Нарадзілася ў Ленінградзе ў сям'і чыгуначніка. У часе вайны разам з бацькамі была вывезеная на працы ў Любэк (зямля Шлезвіг-Гальштайн, Нямеччына). Адтуль у 1950 годзе пераехала ў Аўстралію. Жыла ў Пэрце, дзе пазнаёмілася й у 1953 годзе пабралася шлюбам зь Міхасём Раецкім. Нарадзіла двух сыноў. Ад самога пачатку далучылася да грамады беларусаў Пэрту. Дапамагала ў пабудове Беларускага Народнага Дому. Сяброўка Беларускага Аб'еднаньня ў Заходняй Аўстраліі, актыўна ўдзельнічала ў нацыянальных мерапрыемствах, антыкамуністычных дэманстрацыях, сьпявала ў царкоўным хоры. Адна з ініцыятараў заснаваньня беларускіх радыёпраграмаў у Пэрце. Пахаваная на беларускай сэкцыі могілак Караката ў Пэрце.



**Раецкі Міхась (малодшы)** (нар. 1957). Нарадзіўся ў Аўстраліі. Настаўнік паводле адукацыі. Актыўны ўдзельнік беларускага грамадзкага жыцьця ў Пэрце. Радны БНР. Ад 1987 году старшыня Беларускага Аб'еднаньня ў Заходняй Аўстраліі.

**Раецкі Міхась (старэйшы)** (2.11.1927 — 22.10.2003). Нарадзіўся ў Менску. У 1950 годзе прыехаў у Аўстралію, дзе працаваў у сыстэме водазабесьпячэньня Заходняе Аўстраліі. Адзін з заснавальнікаў і першы старшыня аддзелу Задзіночаньня Беларускіх Вэтэранаў у Кэльмскот (Пэрт). Ад 1958 году займаў пасады старшыні, скарбніка, сакратара Беларускага Аб'еднаньня ў Заходняй Аўстраліі. Радны БНР. Ініцыятар і доўгачасовы кіраўнік Беларускага Радыёвага Камітэту ў Пэрце, стваральнік і дыктар беларускіх радыёпраграмаў. Аўтар зацемак пра жыцьцё беларускай грамады ў Заходняй Аўстраліі ў газэце «Беларус». Пахаваны на беларускай сэкцыі могілак Караката ў Пэрце.

**Раманоўскі Аляксандар** (9.03.1915 — 12.10.1955). Нарадзіўся ў Віцебску ў сям'і працоўных. Скончыў Віцебскі мастацкі тэхнікум, працаваў настаўнікам малюнку, мастаком-дэкаратарам тэатру. У 1940 годзе — мабілізаваны ў армію й накіраваны на фінскі фронт. У 1941 годзе трапіў у нямецкі палон. Пасьля Другой Сусьветнай вайны працягнуў мастацкую дзейнасьць у Нямеччыне, адкуль у 1949 годзе выехаў на эміграцыю ў Аўстралію. У грамадзкім жыцьці беларускай грамады Сыднэю пасьля падзелу пачатку 50-х гадоў актыўнага ўдзелу ня браў, спасылаючыся на нежаданьне станавіцца на адзін з бакоў. Але працягваў актыўную творчую працу, значная частка якой была прасякнутая тэматыкай падсавецкай Беларусі. Ягоныя карыкатуры-скетчы друкаваліся на старонках газэты «Бацькаўшчына», часопіса «Конадні», некаторых расейскіх пэрыёдыкаў. У 1955 годзе ў Сыднэі выйшаў асобны сшытак з 14 скетчаў «За жалезнай заслонай». Неаднаразовы ўдзельнік разнастайных мастацкіх выставаў. Апошняя зь іх, што аб'яднала творы 30 найвыдатнейшых аўстралійскіх мастакоў, адбылася ў Сыднэі ў верасьні 1955 году, за месяц да трагічнай сьмерці мастака.

**Родзевіч Усевалад** (11.09.1916 — 17.07.1998). Нарадзіўся ў сям'і праваслаўнага вайсковага сьвятара. Вучыўся ў польскай гімназіі ў Пінску, пазьней — у гандлёвай акадэміі ў Львове. Мабілізаваны ў польскае войска, у 1939 годзе трапіў у нямецкі палон. Быў вызвалены, але па нейкім часе трапіў у канцэнтрацыйны лягер у Трыры (зямля Рэйнлянд-Пфальц, Нямеччына). Вызваліўся, вярнуўся ў Беларусь. Ад'ютант прэзыдэнта Радаслава Астроўскага, лейтэнант БКА, удзельнік Другога Ўсебеларускага Кангрэсу. Па вайне некаторы час жыў у Мюнхене, а ў 1949 годзе разам зь сям'ёй выехаў у Аўстралію. Пасяліўся ў Сыднэі, дзе далучыўся да жыцьця беларускай грамады. Быў сябрам Беларускага Аб'еднаньня ў Аўстраліі, узначаленага Міхасём Зуем. Пазьней удзельнічаў у нацыянальных мерапрыемствах, ладжаных Беларускім Культурна-Грамадзкім Клюбам.

**Розмысл Сяргей** (29.09.1905 — 28.08.1969). Нарадзіўся ў Санкт-Пецярбургу ў беларускай сям'і, якая ў 1922 годзе вярнулася на Радзіму

й пасялілася ў Гудзінішках на Лідчыне. Афіцэр БКА. Дэлегат Другога Ўсебеларускага Кангрэсу ад Лідзкай акругі. У 1944 годзе выехаў у Нямеччыну, адкуль у 1950 годзе безь сям'і апынуўся ў Аўстраліі. Адзін з стваральнікаў Беларускага Аб'еднаньня ў Вікторыі, дзе займаў розныя пасады, у тым ліку й старшыні. Удзельнік беларускага школьнага камітэту ў Мэльбурне ў другой палове 50-х гадоў. Сябра царкоўнай рады парафіі Сьвятой Эўфрасіньні Полацкай (БПЦ) у Мэльбурне. Удзельнік Беларускага Цэнтральнага Камітэту ў Вікторыі. Сябра Дэлегатуры БЦР у Аўстраліі. Трагічна загінуў у аўтамабільнай катастрофе. Пахаваны на могілках Спрынгвэйл у Мэльбурне.

**Ролсан Янка** (сапр. Гадзіцкі, 1.08.1912 — 23.01.1994). Нарадзіўся ў в. Вялень Ігуменскага павету (цяпер Пухавіцкі раён Менскай вобласьці) у сялянскай сям'і. Вучыўся ў сельскагаспадарчым інстытуце ў Менску й у тэхнікуме цяжкай прамысловасьці ў Харкаве (Украіна). Працаваў на вайсковым заводзе ў Ніжнім Тагіле (Сьвярдлоўская вобласьць, Расея). Скончыў авіяшколу ў расейскім Ржэве. У якасьці авіямэханіка служыў у 5-й эскадрыльлі, а зь верасьня 1939 году — на «польскім фронце». Па дэмабілізацыі ў студзені 1941 году працаваў на Менскім заводзе імя Варашылава. Падчас нямецкай акупацыі працаваў у беларускай адміністрацыі на Пухавіччыне, ад сакавіка 1944 году — афіцэр БКА. Ад лета 1944 году — на эміграцыі. Жыў у Мюнхене, дзе быў сябрам Беларускага Нацыянальнага Камітэту. У 1950 годзе выехаў у Аўстралію. Актыўна ўдзельнічаў у грамадзкім і рэлігійным жыцьці беларусаў Адэляйды. Займаў розныя пасады ў царкоўнай управе парафіі Сьвятых Апосталаў Пятра й Паўла: быў старшынём, скарбнікам, сакратаром, рэфэрэнтам вонкавых сувязяў. У 1975—1987 гадах — першы старшыня Беларускага Аб'еднаньня ў Паўднёвай Аўстраліі (пакінуў пасаду з прычыны хваробы). Сябра Выканаўчага Камітэту Фэдэральнай Рады Беларускіх Арганізацыяў у Аўстраліі. Аўтар шматлікіх паэтычных твораў, якія публікаваў пад псэўданімамі ВЭР, Крапіва-Жыгучка. У 1980 годзе выдрукаваў паэтычны зборнік «Кліч» (перавыдадзены ў 1982-м). Сталы карэспандэнт газэты «Беларус» (пісаў пад псэўданімам Янка Яр). Аўтар апублікаваных у 1984 годзе ўспамінаў «З глыбінь мінулага».

**Русак Уладзімер** (нар. 20.04.1929). Нарадзіўся ў в. Любішчыцы Косаўскага павету Палескага ваяводзтва (цяпер Івацэвіцкі раён Брэсцкай вобласьці) у сялянскай сям'і. Вучыўся ў польскай, потым у савецкай школах. У часе Другой Сусьветнай вайны разам з бацькамі апынуўся ў Нямеччыне, а пасьля капітуляцыі — у беларускім лягеры Міхельсдорф, дзе вучыўся ў беларускай гімназіі імя Янкі Купалы. У 1950 годзе пераехаў у Аўстралію. Працаваў у Ньюкасьле, потым перабраўся на некаторы час у Сыднэй, але зноў вярнуўся ў Ньюкасл пры канцы 60-х гадоў. Нягледзячы на гэта, трымаў сувязь зь беларусамі Сыднэю. У 1965 годзе — адзін з галоўных ініцыятараў стварэньня Беларускага Культурна-Грамадзкага Клюбу й набыцьця для яго памяшканьня, пазьней доўгія гады быў сябрам Клюбу й рэгулярна прыяжджаў за 300 кілямэтраў на нацыянальныя мерапрыемствы.



**Салавей Алесь** (сапр. Альфрэд Радзюк, на эміграцыі Альбэрт Каднак; 1.05.1922 — 22.01.1978). Нарадзіўся ў в. Крысава Койданаўскага павету (цяпер Дзяржынскі раён Менскай вобласьці). У 1938—1940 гадах вучыўся ў пэдагагічнай вучэльні ў Менску. Пачаў друкавацца ў 1937 годзе. Падчас нямецкай акупацыі супрацоўнічаў зь «Беларускай Газэтай», працаваў у павятовай управе ў Ільлі (Вялейская акруга). Ад 1942 году жыў у Рызе (Латвія), працаваў намесьнікам галоўнага рэдактара часопіса «Новы Шлях». Пры канцы Другой Сусьветнай вайны апынуўся ў Зальцбургу (Аўстрыя), удзельнічаў у выданьні газэты «Зь Беларускага Жыцьця» й часопіса «Пагоня». Ад 1949 году — у Аўстраліі. Першыя некалькі гадоў жыў у Адэляйдзе, удзельнічаў у арганізацыйным сходзе тутэйшых беларусаў у лютым 1950 году. Пазьней перабраўся ў Мэльбурн, дзе таксама далучыўся да грамадзкага жыцьця. Сябра Згуртаваньня Беларусаў у Вікторыі, пазьней — культурны рэфэрэнт Беларускага Цэнтральнага Камітэту ў Вікторыі й сябра беларускае сэкцыі радыё *3ZZ* у Мэльбурне (1976—1977). Паэтычнай творчасьцю ў Аўстраліі займаўся мала. У 1982 годзе, ужо пасьля сьмерці паэта, у Беларускім Інстытуце Літаратуры й Мастацтва ў Нью-Ёрку выйшаў зборнік вершаў «Нятускная краса», куды ўвайшлі й творы аўстралійскага пэрыяду ягонага жыцьця. Пахаваны на беларускай дзялянцы могільніку Фоўкнэр у Мэльбурне.

**Сідлярэвіч Аўгенія** (дзяв. Парэцкая; нар. 22.05.1924). Нарадзілася ў в. Люшча Лунінецкага павету (Брэсцкая вобласьць). Вучылася ў польскай школе. У 1943 годзе была вывезеная на працы ў Нямеччыну ў горад Эрфурт. Па вайне апынулася ў Польшчы, тады як бацькі выехалі зь іншымі дзецьмі ў Аўстралію. У 1958 годзе намаганьнямі бацькоў таксама пераехала ў Аўстралію, дзе ў 1960 годзе ў Мэльбурне пазнаёмілася з Уладзімерам Сідлярэвічам. Ад гэтага часу далучылася да беларускай грамадзкай дзейнасьці. Сьпявала ў беларускім мяшаным хоры. Была сяброўкай Беларускага Цэнтральнага Камітэту ў Вікторыі, апошнія гады ўзначальвала Беларускі Жаночы Камітэт у Вікторыі. Удзельніца Беларускага Сацыяльнага Клюбу.

**Сідлярэвіч Уладзімер** (20.09.1922 — 5.11.1999). Нарадзіўся ў в. Праважа (цяпер Воранаўскі раён Гарадзенскай вобласьці). Скончыў савецкую сярэднюю школу ў Лідзе, пазьней атрымаў спэцыяльнасьць настаўніка й працаваў у пачатковай школе ў Васілішках. У 1944 годзе ўступіў у шэрагі БКА, быў дэлегатам Другога Ўсебеларускага Кангрэсу ад Лідзкай акругі. Па капітуляцыі Нямеччыны апынуўся ў брытанскай зоне акупацыі, у Гамбургу, дзе ў 1948 годзе скончыў коледж і атрымаў пасьведчаньне інжынэра будоўлі. У 1950 годзе прыехаў у Аўстралію, дзе першыя два гады працаваў у Адэляйдзе. У 1952 годзе перабраўся ў Мэльбурн, дзе адразу далучыўся да актыўнага грамадзкага жыцьця беларусаў. Сябра рэдакцыі часопіса «Новае Жыцьцё». Адзін з ініцыятараў стварэньня й доўгагадовы старшыня Камітэту

Набыцьця Беларускага Дому (пазьней Каапэратыву). Быў настаўнікам беларускай школы, якая некаторы час знаходзілася ў ягонай хаце. Сябра аддзелу БВФ у Вікторыі, трымаў цесную сувязь зь ягоным старшынём Дзьмітрыем Касмовічам. Цягам 70—80-х гадоў рэгулярна абіраўся на пасаду старшыні Беларускага Цэнтральнага Камітэту ў Вікторыі. Таксама быў старшынём Беларускага Нацыянальнага Фонду, заснаванага для фінансаваньня беларускіх дэлегацыяў на міжнародных канфэрэнцыях. У 1981 годзе — старшыня арганізацыйнага камітэту Чацьвертай Сустрэчы Беларусаў Аўстраліі. Ад 1985 году й да канца жыцьця — скарбнік ФРБАА. Таксама быў старшынём Чарнобыльскага фонду. Пахаваны на беларускай дзялянцы могільніку Фоўкнэр у Мэльбурне.

**Сіткоўская Алена** (нар. 6.05.1925). Паходзіла з Докшыц (сёньня Віцебская вобласьць). У 1950 годзе разам з мужам Кастусём прыехала ў Аўстралію. Але праз два гады ўзяла развод. Выхоўвала прыёмных дзяцей. Актыўная ўдзельніца беларускай грамады Сыднэю. У 1973—1989 гадах — сяброўка Беларускага Культурна-Грамадзкага Клюбу. Скарбнік і некаторы час старшыня Жаночага Камітэту. Актыўна дапамагала ў арганізацыі беларускіх мерапрыемстваў. Пазьней адышла ад грамадзкай дзейнасьці зь сямейных прычынаў.

**Сіткоўскі Кастусь** (4.04.1923 — 26.05.1994). Нарадзіўся на Наваградчыне. Паводле адукацыі настаўнік. Ад 1950 году — у Аўстраліі. Адзін з стваральнікаў, доўгачасовы сябра ўправы, а ў 1954—1955 гадах і старшыня Беларускага Аб'еднаньня ў Новай Паўднёвай Валіі. Радны БНР. Удзельнік Беларускага Культурна-Грамадзкага Клюбу ў Сыднэі, дзе доўгі час выконваў абавязкі дырэктара.

**Сітнік Аўген, айцец** (4.07.1927 — 29.08.1986). Нарадзіўся ў в. Валынка (?). Падчас вайны апынуўся ў Нямеччыне. Пазьней эміграваў у Паўднёвую Аўстралію, дзе хутка ажаніўся з дачкой айца Міхала (Шчурко) і далучыўся да беларускай грамады. Дапамагаў у пабудове царквы Сьвятых Апосталаў Пятра й Паўла ў Адэляйдзе, выконваў функцыі скарбніка ў парафіяльнай радзе. У 1978 годзе ў зьвязку з раптоўным ад'ездам у Сыднэй айца Георга (Джонліча), тагачаснага настаяцеля беларускай парафіі, даў згоду стаць сьвятаром. 30 ліпеня 1978 году архіяпіскап Мікалай рукапаклаў яго ў сьвятарскі сан. На пасадзе настаяцеля беларускай парафіі заставаўся да канца жыцьця.

**Скабей Мікола** (23.10.1905 — 7.12.1992). У часе нямецкай акупацыі кіраўнік беларускай паліцыі ў Ільлянскай акрузе. Дэлегат Другога Ўсебеларускага Кангрэсу, адразу па сканчэньні якога выехаў зь Беларусі ў Нямеччыну. У 1948 годзе прыехаў у Аўстралію. Нейкі час узначальваў Сэктар Рады БНР у Вікторыі. У 50-х гадах быў на чале Згуртаваньня Беларусаў у Вікторыі, а пасьля стварэньня агульнага Беларускага Цэнтральнага Камітэту стаў першым ягоным кіраўніком і далей рэгулярна абіраўся на гэтую пасаду цягам 60—80-х гадоў. Пры ягоным кіраўніцтве была наладжаная праца чарговай беларускай школы. Адзін з ініцыятараў набыцьця Беларускага Дому й удзельнік управы Каапэратыву Беларускага Дому. Актыўна падтрымаў ідэю Сустрэчаў Беларусаў Аўстраліі. Меў цесныя сувязі з беларускімі эмігрантамі ў іншых краінах сьвету, і ў прыватнасьці з прэзыдэнтам Рады БНР Міколам Абрамчыкам. Пахаваны на беларускай дзялянцы могільніку Фоўкнэр у Мэльбурне.



**Смаль Аляксандар** (24.05.1912 — 19.03.1990). Нарадзіўся на Наваградчыне ў сялянскай сям'і. Скончыў настаўніцкія курсы ў Вільні, настаўнічаў у Заходняй Беларусі. У 1946—1948 гадах выкладаў геаграфію ў беларускай гімназіі імя Янкі Купалы ў Міхельсдорфе (Нямеччына). Ад 1948 году — у Аўстраліі. Адзін з арганізатараў надпартыйнага Беларускага Аб'еднаньня ў Новай Паўднёвай Валіі, пазьней перайменаванага на Беларускае Аб'еднаньне ў Аўстраліі. Пасьля падзелу — сябра Беларускага Аб'еднаньня ў Новай Паўднёвай Валіі, рэдактар БНРаўскага варыянту часопіса «Новае Жыцьцё». Актыўны й доўгагадовы ўдзельнік жыцьця беларускай грамады. Спрабаваў арганізаваць беларускую школу ў Сыднэі, але няўдала. Сябра Беларускага Культурна-Грамадзкага Клюбу. Пахаваны на беларуска-ўкраінскай сэкцыі могільніку Роквуд у Сыднэі.

**Станкевіч Кастусь** (1925 — 27.11.1989). Нарадзіўся ў м. Турэц (сёньня Карэліцкі раён Гарадзенскай вобласьці) у сялянскай сям'і. Падчас нямецкай акупацыі вывезены на працы ў Нямеччыну, адкуль у 1949 годзе разам з жонкай Эміліяй эміграваў у Аўстралію. У Адэляйдзе вучыўся ў Школе радыё- й тэлемэханікі й, атрымаўшы дыплём, працаваў у фірме «Філіпс», а потым арганізаваў уласны бізнэс. Адразу далучыўся да новаарганізаванай беларускай грамады ў Адэляйдзе. Актыўна дапамагаў у пабудове беларускай царквы й ад 1966 году займаў розныя пасады ў парафіяльнай радзе, а ў 1974—1988 гадах — яе старшыня. Ініцыятар пабудовы прыцаркоўнай залі, што ператварылася ў цэнтар беларускіх мерапрыемстваў. Напісаў партрэты Янкі Купалы й Якуба Коласа для беларускай залі. У 1984 годзе — старшыня Фэдэральнай Рады Беларускіх Арганізацыяў у Аўстраліі. Ад жніўня 1989 году (апошнія месяцы жыцьця) выконваў абавязкі сакратара Беларускага Аб'еднаньня ў Паўднёвай Аўстраліі.

**Субач Тамара** (дзяв. Карп, у першым шлюбе Басарыновіч; нар. 1943). Нарадзілася ў Карэлічах (сёньня Гарадзенская вобласьць). Хутка па нараджэньні разам з бацькамі апынулася ў Нямеччыне, адкуль у 1949 годзе прыехала ў Аўстралію. Вучылася ў аўстралійскай школе ў Мэльбурне. Працавала адміністратарам-мэнэджэрам. Разам з бацькамі ўдзельнічала ў жыцьці беларускай грамады, асабліва парафіі Трох Віленскіх Пакутнікаў у Мэльбурне. Ад самага стварэньня ўдзельнічала ў беларускай танцавальнай групе. Пры канцы 70-х гадоў рэарганізавала яе пад назовам «Каліна» й стала нязьменнай яе кіраўніцай. Пасьля сьмерці першага мужа, зь якім мела двух дзяцей, пабралася шлюбам зь Мікалаем Субачам. Актыўная працаўніца Сястрыцтва парафіі Трох Віленскіх Пакутнікаў.

**Супрунчык Марыя** (дзяв. Сакава; нар. 1931(?)). Нарадзілася ў Старых Дарогах (сёньня Менская вобласьць). За савецкім часам вучы-

лася ў пачатковай школе. У часе Другой Сусьветнай вайны апынулася разам з бацькамі ў лягерах Нямеччыны. У 1947 годзе пабралася шлюбам з Іванам Супрунчыкам. У 1950 годзе разам з мужам і малой дачкой пераехала ў Аўстралію. Спачатку жыла ў Заходняй Аўстраліі, затым — у Сыднэі. На некаторы час зь сям'ёй пераехала да бацькоў у ЗША, але хутка вярнулася назад і настала пасялілася ў Сыднэі. Працавала на фабрыцы. Далучылася да беларускай грамады. Сяброўка Беларускага Культурна-Грамадзкага Клюбу й актыўная ўдзельніца Жаночага Камітэту. Дапамагала ў арганізацыі нацыянальных мерапрыемстваў.

**Сьлесарэвіч Вольга** (дзяв. Цьвірко; 11.04.1922 — 1990). Нарадзілася ў в. Рудня Жыткавіцкага раёну (сёньня Гомельская вобласьць) у сялянскай сям'і. На пачатку 40-х гадоў пабралася шлюбам зь Язэпам Сьлесарэвічам і нарадзіла дачку й сына. У 1943 годзе была вывезеная на працы ў Нямеччыну. Па сканчэньні вайны й колькіх гадоў лягераў Ды-Пі, дзе нарадзіўся яшчэ адзін сын, у 1950 годзе разам зь сям'ёй выехала ў Аўстралію. Пасялілася ў Мэльбурне, дзе адразу далучылася да жыцьця беларускай грамады. Удзельнічала ў працы Беларускага Цэнтральнага Камітэту ў Вікторыі. Ініцыятарка й доўгагадовая старшыня Беларускага Жаночага Камітэту ў Вікторыі.

**Сьлесарэвіч Язэп** (15.05.1913 — ?). Прыехаў у Аўстралію разам зь сям'ёй у 1949 годзе. Ад пачатку 50-х гадоў актыўна ўдзельнічаў у грамадзкім жыцьці беларусаў Мэльбурну. Сябра Беларускага Аб'еднаньня ў Вікторыі. У 60-х гадах актыўны ўдзельнік стварэньня парафіі Сьвятой Эўфрасіньні Полацкай у юрысдыкцыі Сусьветнага Патрыярхату, ініцыяванага архімандрытам Мадэстам. Сябра Беларускага Цэнтральнага Камітэту ў Вікторыі, актыўна спрыяў набыцьцю й рамонту Беларускага Дому. Спрабаваў арганізаваць беларускую моладзь Мэльбурну ў 70-х гадах. Тады ж браў удзел у аднаўленьні дзейнасьці беларускай школы ў Мэльбурне, а таксама ў Сустрэчах Беларусаў Аўстраліі.

**Тамашэўская Вольга** (нар. 1.01.1922). Нарадзілася ў Мар'інай Горцы (сёньня Менская вобласьць). У 1950 годзе зь Нямеччыны пераехала ў Аўстралію. Разам з мужам Стэфанам Тамашэўскім пасялілася ў Сыднэі. Далучылася да тутэйшай беларускай грамады. Удзельніца Беларускага Культурна-Грамадзкага Клюбу й доўгагадовая кіраўніца Жаночага Камітэту. Актыўна дапамагала ў падрыхтоўцы нацыянальных мерапрыемстваў беларусаў Сыднэю.

**Трысмакоў Парфіры** (17.11.1903 — 8.01.1985). Паходзіў з Гомельшчыны. За савецкім часам працаваў выкладчыкам у машынабудаўнічым інстытуце ў Гомелі, потым — загадчыкам катэдры тэхнічнай матэматыкі Беларускага політэхнічнага інстытуту ў Менску. Падчас нямецкай акупацыі працаваў у Менскай гарадзкой управе, быў сябрам Беларускага Навуковага Таварыства. Ад лета 1944 году — на эміграцыі. На працягу 1945—1949 гадоў працаваў настаўнікам фізыкі й хіміі ў беларускай гімназіі імя Янкі Купалы ў Рэгенсбургу. Эміграваў у Аўстралію, дзе ў Адэляйдзе далучыўся да беларускай грамады. Актыўны



ўдзельнік жыцьця беларускай парафіі Сьвятых Апосталаў Пятра й Паўла, уваходзіў у царкоўную ўправу, быў дэлегатам на II Епархіяльным зьезьдзе духавенства й вернікаў БАПЦ у Мэльбурне ў 1960 годзе. У 1974 годзе абраны дэлегатам на XIII Сэсію Рады БНР. Сябра Беларускага Аб'еднаньня ў Паўднёвай Аўстраліі.

**Хаванскі Канстанцін** (1.08.1910 — 28.03.1984). Паходзіў з ваколіцаў Івацэвічаў (сёньня Брэсцкая вобласьць) зь сям'і нашчадкаў князёў Хаванскіх. Вучыўся ў гарадзкой вучэльні, пазьней служыў у польскім войску й трапіў у нямецкі палон. У паваеннай Нямеччыне апынуўся ў беларускім лягеры Ватэнштэт. У 1950 годзе разам з жонкай Акулінай прыехаў у Аўстралію, дзе спачатку працаваў паводле кантракту на фэрме. У 1952 годзе перабраўся ў Сыднэй і далучыўся да грамадзкага жыцьця беларусаў. Быў сябрам Беларускага Аб'еднаньня ў Аўстраліі й некаторы час займаў тут пасаду скарбніка. Ад стварэньня Беларускага Культурна-Грамадзкага Клюбу ўваходзіў у лік ягоных дырэктараў. Актыўнай працы ад 1975 году перашкодзіла цяжкая хвароба. Пахаваны на беларуска-украінскай сэкцыі могільніку Роквуд у Сыднэі.

**Ціхан Міхась** (18.09.1919 — 2003). Нарадзіўся ў ваколіцах Баранавічаў (сёньня Брэсцкая вобласьць). Пасьля 1939 году быў мабілізаваны ў Савецкую армію, удзельнічаў у ваенных дзеяньнях у Малдове, дзе трапіў у нямецкі палон. Ад 1947 году — у Аўстраліі. У сакавіку 1950 году — удзельнік першага сходу сяброў надпартыйнага Беларускага Аб'еднаньня ў Новай Паўднёвай Валіі, перайменаванага пазьней у Беларускае Аб'еднаньне ў Аўстраліі. Адзін з арганізатараў беларускага аддзелу міжнацыянальнай выставы з нагоды 50-годзьдзя Аўстралійскага Саюзу ў 1951 годзе, за што быў адзначаны дыплёмам ад аўстралійскага ўраду. Пасьля падзелу ў беларускім асяродзьдзі Сыднэю быў сябрам БЦРаўскага Беларускага Аб'еднаньня ў Аўстраліі. Адначасова сакратар Беларуска-Аўстралійскага Незалежнага Аб'еднаньня ў Новай Паўднёвай Валіі. Ад 1973 году актыўны ўдзельнік Беларускага Культурна-Грамадзкага Клюбу, дзе ў 1987 годзе на адзін тэрмін быў абраны старшынём.

**Чабатар Алеся** (дзяв. Бушма; 1910 — 23.01.1991). Нарадзілася ў м. Далятычы (сёньня Навагрудзкі раён Гарадзенскай вобласьці). Ад 1929 году актыўная ўдзельніца самадзейнасьці беларускай моладзі. У 1932—1939 гадах — заступніца старшыні аддзелу Беларускага Інстытуту Гаспадаркі й Культуры. За беларускую грамадзкую дзейнасьць зьведала перасьлед польскіх уладаў, арышты. Пасьля Другой Сусьветнай вайны празь Нямеччыну апынулася ў Аўстраліі. Жыла ў Альбані (Заходняя Аўстралія). Ад самога прыезду ў Аўстралію актыўна далучылася да беларускай грамадзкай дзейнасьці. Удзельнічала ў мерапрыемствах, ладжаных аддзелам Задзіночаньня Беларускіх Вэтэранаў у Пэрце й Беларускім Аб'еднаньнем у Заходняй Аўстраліі, сяброўкай якога была доўгія часы. Шмат дапамагала пабудове Беларускага Народнага Дому, для якога вышыла й ахвяравала Пагоню. У шлюбе з Кастусём Чабатаром мела трох дзяцей.

**Чабатар Кастусь** (20.06.1914 — ?). Паходзіць з м. Далятычы (сёньня Наваградзкі раён Гарадзенскай вобласьці). Верагодна, вучыўся ў марыянаў у Друі. Падчас нямецкай акупацыі — у Беларускай Краёвай Абароне. Па сканчэньні Другой Сусьветнай вайны апынуўся ў лягерах Нямеччыны, адкуль у 1948 годзе выехаў у Аўстралію. Пасяліўся ў горадзе Альбані (Заходняя Аўстралія). Падтрымліваў сувязі зь беларусамі Пэрту. Быў сябрам Беларускага Аб'еднаньня ў Заходняй Аўстраліі, рэгулярна ўдзельнічаў у ягоных мерапрыемствах і дапамагаў у набыцьці Беларускага Народнага Дому. Меў трывалыя кантакты зь беларускімі дзеячамі й выданьнямі ў іншых краінах. У 60—70-х гадах друкаваў свае нарысы пра жыцьцё ў Аўстраліі й успаміны ў часопісе «Божым Шляхам».

**Чурыла Адам** (7.05.1911 — 24.08.1972). Нарадзіўся ў в. Круты Бераг (сёньня Нясьвіскі раён Менскай вобласьці) у сялянскай сям'і. Да 1932 году працаваў у бацькі на гаспадарцы, служыў у польскім войску. У 1939 годзе ўдзельнічаў у польска-нямецкай кампаніі, пазьбег палону, вярнуўся дадому. У 1944 годзе апынуўся ў Нямеччыне, адкуль у 1948 годзе выехаў у Аўстралію. Актыўна ўдзельнічаў у арганізацыі беларускага жыцьця ў Сыднэі на пачатку 50-х гадоў, але падчас палітычнага падзелу заняў прынцыповую пазыцыю супраць яго. Па нейкім часе далучыўся да арганізацыі «незалежнікаў» у Сыднэі. У 1967 годзе падтрымліваў аб'яднаўчыя ініцыятывы й наступнае стварэньне Беларускага Культурна-Грамадзкага Клюбу. Паводле тэстамэнту, пакінуў адзін з сваіх дамоў Беларускаму Культурна-Грамадзкаму Клюбу. Пахаваны на беларуска-ўкраінскай сэкцыі могільніку Роквуд у Сыднэі.

**Чычэліс Васіль, айцец** (6.01.1915 — 5.07.1973). Нарадзіўся ў в. Канюхі Маладэчанскага павету (сёньня Менская вобласьць) у сям'і праваслаўнага сьвятара. Вучыўся ў гімназіі ў Валожыне. Ад 1937 году — у шэрагах польскага войску. Увосень 1939 году трапіў у нямецкі палон, але хутка быў вызвалены. Працаваў у рэдакцыі беларускай газэты «Раніца» ў Бэрліне. Ад ліпеня 1949 году — у Паўднёвай Аўстраліі, дзе далучыўся да беларускай грамады. 27 сьнежня 1959 году з рук архіяпіскапа Сяргея прыняў манаскі чын. 19 лістапада 1967 году высьвячаны ў сьвятары ўкраінскім архіяпіскапам Сыльвэстрам і да канца жыцьця заставаўся настаяцелем беларускай парафіі Сьвятых Апосталаў Пятра й Паўла ў Адэляйдзе.

**Шайпак Вера** (дзяв. Хлябіч; нар. 30.11.1930). Нарадзілася на Беласточчыне ў сялянскай сям'і. Да прыходу немцаў зь перапынкамі вучылася ў школе, а пасьля сьмерці ў 1942 годзе бацькі стала працаваць на гаспадарцы. У 1964 годзе на запрашэньне цёткі прыехала ў Аўстралію, дзе пазнаёмілася й пабралася шлюбам з Рыгорам Шайпаком. Далучылася да беларускай грамады Мэльбурну. Сьпявала ў беларускім мяшаным хоры. Была вучаніцай Алеся Салаўя ў майстэрстве дэклямацыі. Сяброўка Беларускага Цэнтральнага Камітэту ў Вікторыі й Беларускага Жаночага Камітэту. Актыўна ўдзельнічала ў падрыхтоўцы нацыянальных мерапрыемстваў. Сябра Беларускага Сацыяльнага Клюбу.



**Шайпак Рыгор** (нар. 18.04.1918). У Аўстраліі ад 1950 году. Цягам 50—60-х гадоў жыў у Адэляйдзе, дзе дапамагаў у арганізацыі парафіі БАПЦ і будаўніцтве царквы. Пры канцы 60-х пераехаў у Мэльбурн, дзе стаў сябрам Беларускага Цэнтральнага Камітэту ў Вікторыі, Каапэратыву Беларускага Дому, а таксама ўваходзіў ва ўправу Беларускага Дому й удзельнічаў у ягоным рамонце. Актыўна дапамагаў у арганізацыі Сустрэчаў Беларусаў Аўстраліі ў Мэльбурне. Доўгагадовы парафіянін царквы Трох Віленскіх Пакутнікаў. Ад часу арганізацыі ў 1994 годзе пры БАПЦ Беларускага Сацыяльнага Клюбу нязьменны яго старшыня.

**Шараевіч Адам** (15.05.1904 — 12.07.1984). Нарадзіўся ў в. Пухавічы Жыткавіцкага раёну (сёньня Гомельская вобласьць). У часе Другой Сусьветнай вайны апынуўся ў Нямеччыне, адкуль у 1950 годзе разам зь сям'ёй выехаў у Аўстралію. Жыў у Адэляйдзе, дзе далучыўся да рэлігійнага жыцьця беларусаў. Актыўны ўдзельнік пабудовы беларускай царквы. Сябра парафіяльнай рады й доўгагадовы царкоўны стараста.

**Шаўцоў Сымон** (17.04.1911 — 8.05.1999). Нарадзіўся на Случчыне. У 30-х гадах працаваў на машынабудаўнічым заводзе імя Варашылава ў Менску. У 1939 годзе скончыў гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўнівэрсытэту. Настаўнічаў у в. Капцэвічы (Петрыкаўскі раён Гомельскай вобласьці), потым служыў у Чырвонай Арміі, трапіў у палон. Скончыў школу прапагандыстаў у Вустраве (пад Бэрлінам), быў накіраваны ў Менск. Пры канцы Другой Сусьветнай вайны зноў апынуўся ў Нямеччыне. Настаўнічаў у беларускай школе ў Мітэнвальдзе. Ад 1949 году — у Аўстраліі. Падтрымліваў сувязі зь беларускімі арганізацыямі Сыднэю. Сябра Беларускага Культурна-Грамадзкага Клюбу. Аўтар кнігі «Мая Адысея», што пабачыла сьвет у 1999 годзе й утрымлівала нізку ўласных вершаў і аўтабіяграфічны нарыс зь невялікім апісаньнем абставінаў жыцьця ў Аўстраліі.

**Шкода Язэп** (нар. 8.06.1920). Нарадзіўся ў ваколіцах Нясьвіжу (Менская вобласьць). Ад 1948 году — у Аўстраліі. У сакавіку 1950 году — удзельнік першага сходу сяброў надпартыйнага Беларускага Аб'еднаньня ў Новай Паўднёвай Валіі, перайменаванага пазьней на Беларускае Аб'еднаньне ў Аўстраліі. Пасьля арганізацыйнага падзелу ў 1951 годзе стаў на бок прыхільнікаў БЦР. Стваральнік і дырэктар Беларускага Культурна-Асьветнага Клюбу ў Сыднэі (1950—1954). Ад 1973 году сябра Беларускага Культурна-Грамадзкага Клюбу, цягам некалькіх гадоў — ягоны скарбнік і дырэктар.

**Шкутка Анатоль** (15.01.1908 — ?). Паходзіў з Заходняй Беларусі. У 30-х гадах вучыўся ў Бэрлінскім унівэрсытэце й атрымаў дыплём інжынэра. Падчас Другой Сусьветнай вайны — старшыня Беларускага Прадстаўніцтва ў Бэрліне. Па капітуляцыі Нямеччыны стварыў Беларускі камітэт у Браўншвайгу (Ніжняя Саксонія). У 1949 годзе разам зь сям'ёй выехаў у Аўстралію. Пасяліўся ў Брысбэне (Квінслэнд), дзе спрабаваў наладзіць уласны бізнэс. Да канца 50-х гадоў падтрымліваў сувязі зь беларусамі Сыднэю. Быў удзельнікам арганізацыйнага сходу

тутэйшых беларусаў у сакавіку 1950 году й заснаваньня агульнага Беларускага Аб'еднаньня ў Новай Паўднёвай Валіі (потым Беларускага Аб'еднаньня ў Аўстраліі). Пасьля падзелу арганізацыі стаў на бок прыхільнікаў БЦР і колькі часу выступаў як кіраўнік аддзелу БАА ў Квінслэндзе. Аднак ад канца 50-х гадоў зьвесткі пра ягоную дзейнасьць губляюцца.

**Шнэк Алег** (нар. 7.02.1930). Нарадзіўся ў Ленінградзе ў сям'і беларускага вайскоўца Сьцяпана Шнэка ў часе ягонага навучаньня ў вайсковай акадэміі. Разам з бацькамі колькі часу жыў у Чыце, а ў 1939 годзе прыехаў у Слуцак. У часе вайны быў дружыновым Саюзу Беларускай Моладзі. Летам 1944 году разам зь сям'ёй апынуўся ў Нямеччыне. У беларускім лягеры Ватэнштэт удзельнік Першага Сьцягу Беларускіх Скаўтаў і Беларускага Спартовага Аб'еднаньня пры *YMCA*. Ад 1950 году — у Аўстраліі. У Мэльбурне далучыўся да беларускага скаўцкага зьвязу «Ўсяслаў Чарадзей». Удзельнічаў у арганізацыі футбольнай, а пазьней валейбольнай дружыны, быў сакратаром Спартовага клюбу БВР «Зубр». Актыўны сябра розных беларускіх грамадзкіх арганізацыяў Мэльбурну, у тым ліку Беларускага Вызвольнага Руху (Фронту), дзе ад 1992 году быў начальнікам Краёвага Штабу, а ад 1993 году — і ўсяго БВФ. Сябра Беларускага Цэнтральнага Камітэту ў Вікторыі, старшынём якога абраны ў 2003 годзе. Сябра парафіі Трох Віленскіх Пакутнікаў у Мэльбурне, удзельнік Беларускага Сацыяльнага Клюбу. Доўгагадовы заступнік старшыні Фэдэральнай Рады Беларускіх Арганізацыяў у Аўстраліі, дэлегатам якой быў на Першым Зьезьдзе Беларусаў Сьвету ў Менску ў 1993 годзе.

**Шнэк Сьцяпан** (12.10.1900 — 19.01.1952). Нарадзіўся ў в. Лядна (сёньня Слуцкі раён Менскай вобласьці). У 1930—1936 гадах зь невялікім перапынкам вучыўся ў вайсковай акадэміі ў Ленінградзе. Затым кіраваў Домам палітпрасьветы ў горадзе Чыта Забайкальскай вайсковай акругі. У 1938 годзе выключаны з партыі й зволены з войска, пасьля чаго ўвосень 1939 году пасяліўся зь сям'ёй у Слуцку. Працаваў настаўнікам у школе. Падчас нямецкай акупацыі начальнік Слуцкай службы парадку, кіраўнік БКА на Слуцкую акругу й прадстаўнік на яе прэзыдэнта БЦР. Увесну 1944 году арыштаваны нямецкімі ўладамі разам з усёй сям'ёй, але выпушчаны дзякуючы заступніцтву Радаслава Астроўскага. Ад лета 1944 году — на эміграцыі. Падчас побыту ў Бэрліне быў прызначаны кіраўніком вайсковых справаў БЦР. У 1950 годзе прыехаў у Аўстралію. Спачатку працаваў у Новай Паўднёвай Валіі, трымаў сувязь з тутэйшымі беларусамі, а таксама беларускімі дзеячамі ў іншых краінах. Пісаў зацемкі ў эміграцыйныя пэрыёдыкі. Пазьней пераехаў у Мэльбурн да сям'і, дзе скончыў жыцьцё самагубствам. Пахаваны на беларускай дзялянцы могільніку Фоўкнэр у Мэльбурне.

**Шнэк Уладзімер** (псэўд. Случанскі, 23.03.1927—3.02.1995). Нарадзіўся ў Менску ў сям'і вайскоўца Сьцяпана Шнэка. Вучыўся ў Менскай афіцэрскай школе БКА. Па сканчэньні Другой Сусьветнай вайны апынуўся ў лягерах Ды-Пі ў Нямеччыне. У Ватэнштэце вучыўся ў беларускай гімназіі й актыўна ўдзельнічаў у скаўтынгу, надрукаваў першае апавяданьне ў лягерным часопісе пад псэўданімам Уладзімер Случанскі. Ад 1950 году — у Аўстраліі. У 1958—1961 гадах завочна вучыўся ў Мастацкім інстытуце ў Мэльбурне, сябра Згуртаваньня Мастакоў у Вікторыі. У 1969—1972 гадах скончыў Каралеўскі інстытут тэхналёгіі ў Мэльбурне з дыплёмам чарцёжніка. Хутка па прыезьдзе ў Аўстралію далучыўся да беларускай грамады ў Мэльбурне, стаў сябрам Беларускага Аб'еднаньня ў Вікторыі, узначаліў скаўцкі зьвяз «Ўсяслаў Чарадзей». Шмат займаўся літаратурнай дзейнасьцю, выдрукаваў у 1958—1960 гадах гістарычную аповесьць «Драбы», а таксама ўласным коштам выдаў паэму Лявона Случаніна «Рагнеда». Сябра Беларускага Вызвольнага Фронту, займаў розныя пасады ў гэтай арганізацыі ў Аўстраліі, выдаваў часопіс «На Варце» як орган Краёвага Штабу БВФ і гумарыстычны часопіс «Ёрш». Ад 1982 году ў ранзе маёра стаў кіраўніком Краёвага Штабу БВФ, а ў 1986 годзе ўжо як палкоўнік прызначаны заступнікам начальніка Галоўнага Штабу БВФ. Падрыхтаваў і выдаў альбом «Беларуская Краёвая Абарона» (1984). Удзельнічаў у Канфэрэнцыях Сусьветнай Антыкамуністычнай Лігі (1987, 1989), Пленуме БЦР (1988). Ад 1990 году — сакратар управы Беларускага Цэнтральнага Камітэту ў Вікторыі. Удзельнік Першага Зьезду Беларусаў Сьвету ў Менску ў 1993 годзе.



**Шчурко Міхаіл, айцец** (1907 — 11.10.1972). Нарадзіўся ў в. Бялавічы (сёньня Івацэвіцкі раён Брэсцкай вобласьці) у беларускай праваслаўнай сям'і. У 1948 годзе — адзін з ініцыятараў і ўдзельнікаў канфэрэнцыі ў Канстанцы (Нямеччына), на якой была адноўленая БАПЦ. Там жа ўладыкам Сяргеем быў рукапакладзены ў сан ярэя. У 1949 годзе разам зь сям'ёй прыехаў у Аўстралію. У 1950 годзе ўдзельнічаў у першым сходзе беларусаў Паўднёвай Аўстраліі. Ад таго ж году пачаў весьці набажэнствы для беларусаў у лягеры Вудсайд (блізу Адэлайды). Працягваў сьвятарскую дзейнасьць разам з украінскімі сьвятарамі ў Адэляйдзе. Вёў набажэнствы для беларускіх вернікаў у арэндаваных памяшканьнях, пакуль не была пабудаваная й пасьвечаная ў 1963 годзе ўласная царква Сьвятых Апосталаў Пятра й Паўла БАПЦ. На пасадзе настаяцеля беларускай парафіі заставаўся да канца свайго жыцьця.

**Шэка Міхась** (1.01.1926—8.11.1991). Меў тэхнічную асьвету й прафэсію інжынэра. Лейтэнант БКА. У часе Другой Сусьветнай вайны апынуўся ў Нямеччыне, дзе пасьля яе заканчэньня выкладаў ангельскую мову ў беларускай гімназіі ў Ватэнштэце. У 1950 годзе прыехаў у Аўстралію. Першыя гады жыў у Мэльбурне й актыўна ўдзельнічаў у грамадзкім жыцьці беларусаў. Сябра Беларускага Аб'еднаньня ў Вікторыі. Удзельнік рэдкалегіі часопіса «Новае Жыцьцё» ў часе яго мэльбурнскага выданьня. У 1958 годзе пераехаў зь сям'ёй у Джылёнг (мястэчка за 100 кілямэтраў ад Мэльбурну). Нягледзячы на адлегласьць, імкнуўся трымаць сувязь зь беларускімі арганізацыямі. Сябра Беларускага Цэнтральнага Камітэту ў Вікторыі, удзельнік Каапэратыву Беларускага Дому. У 80-х гадах пайшоў на пэнсію й аднавіў актыўны

ўдзел у беларускіх мерапрыемствах. У 1982—1992 гадах — заступнік кіраўніка Краёвага Штабу БВФ у Аўстраліі. У 1983—1985 гадах — старшыня Выканаўчага Камітэту Фэдэральнай Рады Беларускіх Арганізацыяў у Аўстраліі. Ініцыятар выданьня Інфармацыйнага Бюлетэня ФРБАА. У 1989 годзе пераклаў і выдаў «Катэхізіс праваслаўнай царквы». Пахаваны на могілках у Джылёнге.

**Юрша Аўгенія** (дзяв. Князюк, у першым шлюбе Дуданец; нар. 22.10.1926). Нарадзілася ў в. Трыбушкі (цяпер в. Мірная Слонімскага раёну Гарадзенскай вобласьці) у сялянскай сям'і. У 1942 годзе пасьля расстрэлу немцамі бацькоў была вывезена на працы ў Нямеччыну. Працавала на заводзе Люфтганза, а па сканчэньні вайны вучылася на курсах мэдсёстраў. У лягеры Ды-Пі пазнаёмілася й пабралася першым шлюбам з Станіславам Дуданцом. Нарадзіла сына й разам зь сям'ёй у 1950 годзе прыехала ў Аўстралію, дзе нарадзіла яшчэ двух сыноў. Пасьля некалькіх пераездаў у 1954 годзе пасялілася ў Адэляйдзе. У 1964 годзе страціла мужа, а на пачатку 70-х гадоў выйшла за Паўла Юршу. Ад 1967—1968 гадоў наладзіла стасункі зь беларускай грамадою Адэляйды. Стала браць удзел у нацыянальных мерапрыемствах. Сяброўка Беларускага Аб'еднаньня ў Паўднёвай Аўстраліі, дзе ў 1987—1988 гадах працавала на пасадзе сакратара.

**Яцкевіч Данат** (6.05.1924(1922?) — 11.07.1969). Нарадзіўся ў г. Ліда (сёньня Гарадзенская вобласьць). Вайсковец, лейтэнант БКА. Ад 1944 году — у Нямеччыне, дзе браў удзел у беларускіх арганізацыях. У 1949 годзе прыехаў у Аўстралію. Актыўны арганізатар і ўдзельнік беларускага жыцьця ў Брысбэне. Адзін з ініцыятараў стварэньня Брацтва Сьвятога Юрыя БАПЦ. Заснавальнік Задзіночаньня Беларускіх Вэтэранаў у Аўстраліі й выдавец друкаванага органу гэтае арганізацыі пэрыёдыка «Łučnik». Доўгачасовы кальпартатар беларускае прэсы ў Брысбэне. У 1956 годзе разам зь сям'ёй перабраўся ў Мэльбурн, дзе таксама актыўна далучыўся да жыцьця беларускай грамады, быў адным з ініцыятараў набыцьця Беларускага Дому. Займаўся выдавецкай дзейнасьцю. Пад псэўданімам Данат Баян друкаваў невялічкія п'есы для дзяцей.

**Яцкевіч Мадэст, айцец** (1.05.1894 — 27.02.1971). Нарадзіўся ў Паставах (сёньня Віцебская вобласьць) у сям'і праваслаўнага сьвятара. У 1913 годзе скончыў Віленскую гімназію й падчас Першай Сусьветнай вайны настаўнічаў на Віленшчыне. У 1921 годзе рукапакладзены ў сан сьвятара й да 1939 году працаваў у розных парафіях Віленскай япархіі. У часе Другой Сусьветнай вайны — у кляштары Сьвятога Духу ў Вільні. У 1944 годзе выехаў у Аўстрыю, а пазьней — у Аргентыну. У 1956 годзе перабраўся ў Мэльбурн (Аўстралія), дзе ў наступным годзе прыняў манаскі сан з рук архіяпіскапа Сяргея. Адразу далучыўся да жыцьця беларускай грамады. У 1958 годзе зарганізаваў у Мэльбурне парафію Трох Віленскіх Пакутнікаў БАПЦ. Займаўся актыўнай выдавецкай дзейнасьцю — у 1960 годзе апрацаваў і выдаў «Каціхізіс, або Навука веры», Стары й Новы Запаветы, нарыс «Даведкі з гісторыі аўтакефаліі Беларускай Праваслаўнай Царквы», запачаткаваў выданьне часопіса «Наша Царква» як друкаванага органу БАПЦ у Аўстраліі. У жніўні 1962 году пасьля непаразуменьня з архіяпіскапам Сяргеем перайшоў у юрысдыкцыю Сусьветнага Патрыярхату й працягваў душпастырскую дзейнасьць у наваствораней беларускай парафіі Сьвятой Эўфрасіньні Полацкай у Мэльбурне. Да самай сьмерці выдаваў часопіс «Праваслаўным Шляхам».

**Яцкевіч Эўлялія** (нар. 3.09.1923). Нарадзілася на Віленшчыне. Жонка Даната Яцкевіча. У 1946 годзе ў Нямеччыне нарадзіла дачку, а ў 1949 годзе выехала зь сям'ёй у Аўстралію. Першыя гады жыла ў Брысбэне, дзе разам з мужам займалася актыўнай грамадзкай дзейнасьцю, была старшынёй Згуртаваньня Беларускіх Жанчын Аўстраліі, створанага пры Задзіночаньні Беларускіх Вэтэранаў. У 1956 годзе разам зь сям'ёй перабралася ў Мэльбурн, дзе таксама далучылася да грамадзкай дзейнасьці. Адна з арганізатараў і настаўніца першай і другой беларускіх школаў. Кіравала беларускім мяшаным хорам пасьля сьмерці яго стваральніка Пётры Мікуліча. Сяброўка Беларускага Цэнтральнага Камітэту ў Вікторыі, а цягам 1977—1980 гадоў — яго старшыня. У 1976—1978 гадах — ініцыятарка стварэньня й галоўная супрацоўніца беларускай рэдакцыі радыё *3ZZ* у Мэльбурне.

## АРГАНІЗАЦЫІ БЕЛАРУСАЎ АЎСТРАЛІІ

**Аддзел Задзіночаньня Беларускіх Вэтэранаў у Заходняй Аўстраліі**

Заснаваны 6 студзеня 1951 году ў раёне Кэльмскот (Пэрт, Заходняя Аўстралія). Першы старшыня аддзелу ЗБВ — Міхась Раецкі-старэйшы, сакратар — Мікола Лейка. У 1953 годзе ў якасьці старшыні згадваецца Мікола Лейка, а сябрам Галоўнага Кіраўніцтва (у Брысбэне) — капітан Станіслаў Дамброўскі. У 1956 годзе зноў старшыня — Міхась Раецкі-старэйшы.

Аб'ядноўвала былых беларускіх вайскоўцаў і займалася наладжваньнем нацыянальнага жыцьця ў Заходняй Аўстраліі, а таксама прадстаўніцтвам інтарэсаў беларусаў і папулярызацыяй беларускай культуры ў аўстралійскім грамадзтве. Рэгулярна ладзіла беларускія стэнды на шматнацыянальных выставах. Каардынавала свае дзеяньні з Галоўным Кіраўніцтвам Задзіночаньня Беларускіх Вэтэранаў у Аўстраліі й Новай Зэляндыі ў Брысбэне.

У 1956 годзе ў выніку непаразуменьняў з Галоўным Кіраўніцтвам ператворана на Задзіночаньне Беларускіх Вэтэранаў у Заходняй Аўстраліі, але ў такім выглядзе праіснавала толькі некалькі гадоў і было заменена на Беларускае Аб'яднаньне ў Заходняй Аўстраліі.

**Беларуска-Аўстралійскае Незалежнае Аб'еднаньне ў Новай Паўднёвай Валіі**

Створанае каля 1955 году ў Сыднэі ў супрацьвагу арганізацыям прыхільнікаў БЦР і Рады БНР. Заснавальнік — Уладзімер Клуніцкі. Далей у кіраўніцтве арганізацыі былі Лявон Дзядзюля, Янка Макарэвіч і іншыя.

Мэта арганізацыі — аб'яднаць беларускіх «незалежнікаў» у Сыднэі. Падтрымлівала шчыльныя кантакты з газэтай «Беларускі Голас» Сяргея Хмары ў Таронта.

Дакладных зьвестак пра дзейнасьць Аб'еднаньня надзвычай мала. У 70—80-х гадах — сябра Фэдэральнай Рады Беларускіх Арганізацыяў у Аўстраліі.

**Беларускае Аб'еднаньне ў Аўстраліі (Сыднэй)**

Заснаванае ў кастрычніку 1950 году, калі «надпалітычнае» Беларускае Аб'еднаньне ў Новай Паўднёвай Валіі зьмяніла назоў на Беларускае Аб'еднаньне ў Аўстраліі. Першы старшыня — Уладзімер Клуніцкі. У 1951 годзе з арганізацыі выйшлі Уладзімер Клуніцкі (асобна), а таксама прыхільнікі Рады БНР. Ад гэтага часу Беларускае Аб'еднаньне ў Аўстраліі засталося БЦРаўскай арганізацыяй зь Міхасём Зуем на чале (заставаўся старшынём да канца свайго жыцьця). Па сьмерці Міхася Зуя ў 1995 годзе старшынём стаў Міхась Ціхан.

Беларускае Аб'еднаньне ў Аўстраліі задумвалася як агульнааўстралійская арганізацыя (зь сядзібай у Сыднэі) і спрабавала стварыць аддзелы ў іншых рэгіёнах краіны. Так, было абвешчана пра заснаваньне аддзелу ў Брысбэне на чале з Анатолем Шкуткам, але зьвестак пра рэальную дзейнасьць яго няма. Найбольш трывалым быў аддзел у Мэльбурне (Беларускае Аб'еднаньне ў Вікторыі).



Сфэрамі дзейнасьці арганізацыі былі навязваньне сувязяў паміж беларусамі, сацыяльная дапамога, прадстаўніцтва Беларусі ў стасунках зь іншымі арганізацыямі Аўстраліі, наладжваньне нацыянальнага культурнага жыцьця. Пры Беларускім Аб'еднаньні быў заснаваны Асьветна-Культурны Клюб на чале зь Язэпам Шкодам, які існаваў да 1957 году й займаўся культурніцкай дзейнасьцю. У 1950—1960 гадах (але зь перапынкамі) выдаваўся Інфармацыйны Бюлетэнь Беларускага Аб'еднаньня ў Аўстраліі «Новае Жыцьцё». Пры Беларускім Аб'еднаньні дзейнічаў таксама мяшаны хор пад кіраўніцтвам С. Анічкава, драматычны гурток на чале зь Міхасём Зуем.

Пасьля стварэньня Беларускага Культурна-Грамадзкага Клюбу сябры Беларускага Аб'еднаньня ўвайшлі ў гэтую арганізацыю, аднак само Аб'еднаньне не спыніла існаваньня.

Беларускае Аб'еднаньне ў Аўстраліі ад самага пачатку было ўдзельнікам Фэдэральнай Рады Беларускіх Арганізацыяў у Аўстраліі.

**Беларускае Аб'еднаньне ў Вікторыі (аддзел Беларускага Аб'еднаньня ў Аўстраліі)**

Арганізаванае ў траўні 1950 году ў Мэльбурне на сходзе беларусаў, удзельнікаў Беларускага Клюбу. Управа рэгулярна пераабіралася. Першы старшыня — Янка Кудрук. Далей розныя пасады ва ўправе займалі: Павал Гуз, Адам Жураўлевіч, Сяргей Розмысл, Уладзімер Сідлярэвіч ды іншыя.

Абсяг дзейнасьці: наладжваньне нацыянальных мерапрыемстваў, папулярызацыя беларускай культуры сярод аўстралійцаў і прадстаўнікоў іншых нацыянальнасьцяў. Аб'еднаньне ў супрацы з Сыднэем выдавала Інфармацыйны Бюлетэнь Беларускага Аб'еднаньня ў Аўстраліі «Новае Жыцьцё» (у 1952—1956(?) гадах выходзіў у Мэльбурне).

Пры Аб'еднаньні быў створаны Жаночы Камітэт, а таксама ў супрацоўніцтве з арганізацыямі прыхільнікаў Рады БНР — беларуская школа й Камітэт Набыцьця Беларускага Дому.

Беларускае Аб'еднаньне ў Вікторыі спыніла існаваньне ў зьвязку з стварэньнем у 1963 годзе агульнай арганізацыі беларусаў Мэльбурну Беларускага Цэнтральнага Камітэту ў Вікторыі.

**Беларускае Аб'еднаньне ў Заходняй Аўстраліі**

Створанае ў 1958 годзе ў Пэрце. Управа рэгулярна пераабіралася. Старшынямі ў розныя гады былі Міхась Раецкі-старэйшы, Аляксандар Мароз-старэйшы, Леў Дамброўскі. Ад 1987 году старшынём абіраецца Міхась Раецкі-малодшы. Іншыя пасады ва ўправе займалі: Алекс Мароз-малодшы, Марыйка Ёлаб, Сяргей Дамброўскі, Марыя Пятрэнка, Эўфрасіньня Дамброўская, Марыя Мароз, Міхась Ёлаб. У 90-х гадах прадстаўнік вонкавай сувязі — Міхась Раецкі, а газэты «Беларус» — Марыя Мароз.

Галоўныя сфэры дзейнасьці: арганізацыя нацыянальных мерапрыемстваў, прэзэнтацыя беларусаў у стасунках зь іншымі арганізацыямі.

Уласнымі сіламі пабудавалі Беларускі Народны Дом, дзе знаходзіцца рэлігійна-культурны цэнтар беларускага жыцьця. Прадстаўнікі Аб'еднаньня рэгулярна ўдзельнічалі ў мерапрыемствах, ладжаных іншымі нацыянальнымі арганізацыямі й аўстралійскімі ўладамі. Значным дасягненьнем арганізацыі ёсьць шматгадовая дзейнасьць беларускага радыё ў Пэрце.

Ад 1979 году Аб'еднаньне ёсьць сябрам Фэдэральнай Рады Беларускіх Арганізацыяў у Аўстраліі.

**Беларускае Аб'еднаньне ў Новай Паўднёвай Валіі («надпалітычнае»)**

Заснаванае 28 студзеня 1950 году ў Сыднэі, афіцыйна зарэгістраванае 25 сакавіка 1950 году. Старшыня — Уладзімер Клуніцкі.

Мела на мэце аб'яднаньне беларусаў і іх прэзэнтацыю на міжнацыянальных мерапрыемствах. Выдавала першыя нумары Інфармацыйнага Бюлетэня Беларускага Аб'еднаньня ў Новай Паўднёвай Валіі «Новае Жыцьцё».

У кастрычніку 1950 году пераўтворанае ў Беларускае Аб'еднаньне ў Аўстраліі.

**Беларускае Аб'еднаньне ў Новай Паўднёвай Валіі (прыхільнікі Рады БНР)**

Створанае ў сакавіку 1951 году ў Сыднэі прыхільнікамі Рады БНР, што выйшлі з складу Беларускага Аб'еднаньня ў Аўстраліі. Управа рэгулярна пераабіралася. Першы старшыня — Міхась Лужынскі. Далей кіраўнікамі арганізацыі былі: Лявон Рыбнік (1953), Кастусь Сіткоўскі (1954), Генадзь Левановіч (1955, 1956), доктар Язэп Малецкі (1960—1961), Аўгіньня Каранеўская (1964—1966), Мікола Каранеўскі (1967—1970), Станіслаў Нарушэвіч (1972—1980).

Арганізацыя наладжвала грамадзка-культурную дзейнасьць беларусаў у Сыднэі, а таксама рэпрэзэнтавала суайчыньнікаў навонкі. У 1951—1954 гадах выдавала сваю вэрсію Інфармацыйнага Бюлетэня «Новае Жыцьцё», рэдактарамі якога былі Аляксандар Смаль і пазьней Міхась Лужынскі. У 1976 годзе Аб'еднаньне ініцыявала стварэньне ў Сыднэі беларускага радыё.

Беларускае Аб'еднаньне ў Новай Паўднёвай Валіі было ўдзельнікам Фэдэральнай Рады Беларускіх Арганізацыяў у Аўстраліі, і ў 1980 годзе яго дэлегат падпісаў Статут гэтай арганізацыі.

Спыніла дзейнасьць пасьля 1980 году ў зьвязку з тым, што бальшыня ўдзельнікаў далучыліся да Беларускага Культурна-Грамадзкага Клюбу яшчэ ў 1973 годзе й патрэба ў захаваньні асобнай арганізацыі паступова зьнікла.

**Беларускае Аб'еднаньне ў Паўднёвай Аўстраліі**

Заснаванае ўвосень 1977 году ў Адэляйдзе, афіцыйна зарэгістраванае 21 верасьня 1981 году. Управа рэгулярна пераабіралася. Першы старшыня — Янка Ролсан (1977—1987). Далей старшынямі былі: Мікалай Колес (1987—1999), Віктар Кавалеўскі (ад 1999 да сёньня). Іншыя пасады ва ўправе займалі: Уладзімер Акавіты (сакратар (1977—1987), «паблік афіцэр» (1989—1997)), Васіль Яновіч (скарбнік (1977—1981)), Уладзімер Калесьнíковіч (скарбнік (1981—1987, 1989—1993)) ды іншыя.

Беларускае Аб'еднаньне ў Паўднёвай Аўстраліі займалася арганізацыяй нацыянальных мерапрыемстваў, рэпрэзэнтацыяй беларусаў і Беларусі ў стасунках зь іншымі аўстралійскімі арганізацыямі. Актыўна ўдзельнічала ў стварэньні экспазыцыі Этнічнага музэю ў Адэляйдзе. Разам з украінцамі й харватамі пабудавала хастэль Сьвятой Ганны (для састарэлых). У 2001—2003 гадах выдавала «Інфармацыйны Ліст БАПА Інк».

Ад 1978 году — удзельнік Фэдэральнай Рады Беларускіх Арганізацыяў у Аўстраліі.

**Беларуская сэкцыя радыё ў Мэльбурне**

Створаная пры Беларускім Цэнтральным Камітэце ў Вікторыі ў 1975 (1976) годзе з мэтай падрыхтоўкі беларускіх радыёперадачаў для Этнічнага радыё ў Мэльбурне. Ініцыяткай і старшынёй была Эўлялія Яцкевіч. Аднак беларускія радыёперадачы выходзілі толькі ад сакавіка 1976 да ліпеня 1977 году, калі былі ліквідаваныя разам з радыёстанцыяй *3ZZ*, на якой яны дзейнічалі.

**Беларускі Вызвольны Рух (Беларускі Вызвольны Фронт)**

Беларускі Вызвольны Рух у Аўстраліі заснаваны на арганізацыйным сходзе ў Мэльбурне ў 1952 годзе. Кіраўніком арганізацыйнага бюро прызначаны капітан Антон Булаўскі, ягоным заступнікам — лейтэнант Міхась Шэка. У складзе налічвалася больш як 30 вайскоўцаў. Найбольш дзейсны аддзел існаваў у Мэльбурне. Галоўнай мэтай меў аб'яднаньне беларускіх вайскоўцаў для актыўнай грамадзкай дзейнасьці.

У 1955 годзе (згодна з палітычнымі падзеямі ў беларускай эміграцыі ў сьвеце) замест Руху створаны Беларускі Вызвольны Фронт з тымі ж задачамі дзейнасьці. Кіраўнікамі Краёвага Штабу ў Аўстраліі ў розныя гады былі Сяргей Розмысл (1955—1969), Алесь Алехнік (1969—1982), Уладзімер Шнэк (1982—1986, пазьней уваходзіў у Галоўны Штаб БВФ), Міхась Шэка (1986—1992), Алег Шнэк (ад 1992 году).

Абсяг дзейнасьці арганізацыі: аб'яднаньне беларускіх вайскоўцаў, рэпрэзэнтацыя Беларусі на міжнародных антыкамуністычных канфэрэнцыях. Сябра Фэдэральнай Рады Беларускіх Арганізацыяў у Аўстраліі.

**Беларускі Жаночы Камітэт у Вікторыі**

Арганізаваны 10 верасьня 1972 году ў Мэльбурне з ініцыятывы Беларускага Цэнтральнага Камітэту ў Вікторыі. Першая старшыня — Оля Сьлесарэвіч, далей на пасадзе кіраўніцы былі Тамара Грыцук, Аўгенія Сідлярэвіч. Доўгагадовы сакратар арганізацыі — Надзея Груша.

Галоўныя кірункі дзейнасьці былі зьвязаныя з арганізацыяй нацыянальных мерапрыемстваў (падрыхтоўкай залі й пачастунку), апекай над хворымі ўдзельнікамі беларускай грамады, наладжваньнем забаваў, вечарынаў. Зьбіраў ахвяраваньні на дабрачынныя справы, меў улас-

ную касу. Спыніў сваю дзейнасьць з прычыны сталага ўзросту ўдзельніц у 2000 годзе. Грашовыя сродкі, што былі на той момант на рахунку арганізацыі, перададзеныя ў ФРБАА.

**Беларускі Каардынацыйны Камітэт Беларускіх Арганізацыяў у Аўстраліі**

Створаны ў 1952 годзе як арганізацыя, якая мела каардынаваць дзейнасьць прыхільнікаў Рады БНР у Сыднэі й Мэльбурне. У склад Камітэту ўваходзілі: Мікола Скабей, доктар Язэп Малецкі, Мікола Нікан, Аляксандар Калодка, Мітрафан Бакуновіч, Ян Чарнецкі, Аўгіньня Каранеўская. Зьвесткі пра існаваньне Каардынацыйнага Камітэту датычаць 1952—1955 гадоў.

**Беларускі Клюб у Мэльбурне**

Заснаваны на пачатку 1950 году для навязваньня сувязяў з суайчыньнікамі ў Мэльбурне. Старшыня — Аляксандар Калодка, сакратар — Павал Гуз. Наладзілі першае сьвяткаваньне ўгодкаў незалежнасьці ў сакавіку 1950 году ў Мэльбурне. Пазьней сябры Клюбу ўвайшлі ў шэрагі іншых арганізацыяў — як прыхільнікаў БЦР, гэтак і прыхільнікаў Рады БНР у Мэльбурне.

**Беларускі Культурна-Асьветны Клюб у Сыднэі**

Створаны ў 1950 годзе спачатку пад назовам Беларускі Клюб пры «надпалітычным» Беларускім Аб'яднаньні ў Новай Паўднёвай Валіі й працягваў дзейнасьць ужо як Культурна-Асьветны пры арганізацыі прыхільнікаў БЦР. Нязьменным старшынём быў Язэп Шкода.

